№ 25 (3838)

1 красавіка 2014 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

У сталічнай ЖКГ разглядаюць магчымасць стварэння асобнай структуры, у якой можна будзе замовіць поўны пакет дакументаў па перапланіроўцы кватэры.

СОРАМ!

Калі Аляксандр Шакуцін паглядзіць акцыянерам у вочы

Адбыўся гадавы сход акцыянераў адкрытага акцыянернага таварыства «Амкадор». У чарговы раз дарэмнымі аказаліся спадзяванні людзей убачыць старшыню Савета дырэктараў Аляксандра Шакуціна: як і ў мінулым годзе, ён не з'явіўся на галоўную сустрэчу тых, хто некалі падставіў плячо прадпрыемству.



Нехта з прысутных сказаў: «Яго даўно не цікавяць дробныя шараговыя акцыянеры — у яго руках і руках яго набліжаных асноўны пакет акцый, і яны што хочуць, тое і робяць...» Вядома ж, сябе ў крыўду не даюць — даходы будзь здароў! А вось звычайным акцыянерам дывідэнды не выплачваюцца ўжо 15 гадоў. Напляваць на словы А.Лукашэнкі наконт таго, што гэта не нармальна, калі акцыянеры застаюцца з дуляй пад носам.

Вось і за мінулы год чысты прыбытак ААТ «Амкадор» склаў 28,7 мільярда рублёў, але шараговым акцыянерам не перапала ні капейкі. Затое спадар Шакуцін то побач з А.Лукашэнкам у Сочы, то адвальвае велізарныя сумы на Алёну Ланскую, якая прадстаўляе Беларусь на «Еўрабачанні». Днямі ў інтэрнэце з'явіўся здымак катэджа *(гл.справа)* на некалькі соцень квадратных метраў, які бізнесмен А.Шакуцін пабудаваў у так званых «новых Драздах»...

Алесь КУЗЬМІЧ.



nn.by

ПАРАЛЕЛІ

Першая па інфляцыі

За студзень-люты спажывецкія кошты ў нашай краіне ўзраслі на 3,6%.

На другім месцы па тэмпах інфляцыі **Казахстан** — 2,3%. **Арменія** займае трэцяе месца — 1,6%. Далей ідуць **Малдова, Расія і Таджыкістан** (па 1,3%). Затым **Кыргызстан** (1,2%), **Грузія** (1%), **Украіна** (0,8%), **Латвія** (0,6%) і **Азербайджан** (0,2%).

У **Літве** за гэты перыяд спажывецкія кошты не змяніліся. Няма звестак па Туркменістане і Узбекістане. У **Прыднястроўі** кошты павялічыліся на 0,7%.

Беларусь ужо чацвёрты год захоўвае лідарства па тэмпах інфляцыі на тэрыторыі былога СССР, паведамляе БелаПАН.

ПРАТЭСТ

Уладзімір ШЫЛКІН:

«Навошта нам такі прафсаюз?»



Старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Уладзімір Шылкін і яго калегі стаміліся ад нізкіх заробкаў, выйшлі з афіцыйнага прафсаюза і перайшлі ў незалежны.

— Шмат выкладчыкаў павыходзілі з афіцыйнага прафсаюза ў знак пратэсту супраць нізкіх заробкаў, — распавёў Уладзімір Рыгоравіч. — А сем чалавек (разам са мной) стварылі ў ВНУ ячэйку Свабоднага прафсаюза металістаў. Трэба ж нейкім чынам змагацца за свае эканамічныя правы.

— Сітуацыя з заробкамі на самай справе такая кепская?

— Афіцыйны аклад у нас — 1 мільён 300 тысяч. З надбаўкамі я атрымаў «чыстымі» ў студзені каля 3,5 мільёна рублёў. Мяркуйце самі: добры гэта заробак для старшага выкладчыка ўніверсітэта, які адпрацаваў у ВНУ каля 30 гадоў? Праўда, у апошні час зарплата паднялася — у мінулым месяцы было прыкладна 4,5 мільёна. Можа паўплывала тое, што выкладчыкі сталі рашуча дзейнічаць, а можа, так і было запланавана. Але заробкі ўсё роўна мізэрныя... Гэта проста здзек!

— Як кіраўніцтва ўніверсітэта адрэагавала на тое, што вы ўступілі ў незалежны прафсаюз?

— Рэктар са мной гутарыў, але шчыра запытаўся: «Напэўна, не мае сэнсу вас адгаворваць?» Я гэтак жа шчыра адказаў: «Не мае». І дадаў, што, напрыклад, кіраўніцтва ВНУ сябе ў фінансавым плане не крыўдзіць, хоць рэальных лічбаў яны не даюць. Гэта, аказваецца, вялікі сакрэт. А няхай бы публічна агучылі свае заробкі. Што, гэта такая тайна?

— Адным словам, рэпрэсій супраць вас няма...

— Не, ніякага ціску пакуль няма, ды, шчыра кажучы, і зачапіцца ім асабліва няма за што. Хоць не выключаю правакацый і падрыхтаваны да горшага. А ўвогуле, я не шкадую аб тым, што зрабіў. Скажыце: навошта нармальнаму чалавеку той афіцыйны прафсаюз, калі ён нічога не вырашае? За што ім плаціць яшчэ і грошы?!

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ТРАГЕДЫЯ

Атрымаў пісталет і... стрэліў сабе ў скронь

Следчы камітэт праводзіць праверку па факце смерці супрацоўніка міліцыі УУС Гродзенскага аблвыканкама.

«Робіцца ўсё неабходнае для высвятлення ўсіх абставін», — паведаміў афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці **Сяргей Шаршаневіч.**

Больш падрабязнай інфармацыі ў праваахоўных органах пакуль не паведамляюць. Праводзяцца апытанні сведак, судова-медыцынская экспертыза.

Як паведамілі некаторыя сайты, *«на стрэльбах 28 сакавіка на вачах усяго начальства застрэліўся з табельнай зброі маёр міліцыі. І запіску перадсмяротную пакінуў».*

28 сакавіка ў час вучэнняў у прысутнасці мясцовага і мінскага начальства 32-гадовы афіцэр, атрымаўшы пісталет і патроны, стрэліў сабе ў галаву. Ён пакінуў перадсмяротную запіску, у якой прасіў нікога не вінаваціць у сваёй смерці.

На жаль, дадзеная трагедыя далёка не першая ў гісторыі беларускай міліцыі. Увосень 2012 года ў Мінску скончыў жыццё самагубствам супрацоўнік Фрунзенскага РУУС. За апошнія гады здзейснілі самагубства міліцыянты ў Бярозе і Магілёве, а ў Шчучыне супрацоўнік МУС, які нядаўна звольніўся, забіў дачку, параніў жонку і застрэліўся.

З НАГОДЫ

Смяротны транзіт

Алег Лабусаў — навучэнец адной са сталічных школ са спартыўным ухілам — загінуў пасля ўжывання «маркі» (сінтэтычнага наркотыку) у 15-гадовым узросце. Прыгажун, аўтарытэт сярод аднагодкаў, гонар сям'і. Ды і як было не ганарыцца, калі Алег няблага вучыўся, стаў чэмпіёнам Беларусі па веславанні на каноэ. Адна «марка» перакрэсліла і планы, і жыццё...

18-гадовая Маша Шыла з Баранавічаў была, можна сказаць, эталонам. Залаты медаль па заканчэнні гімназіі, кандыдат у майстры спорту па спартыўнай гімнастыцы, студэнтка 1-га курса бюджэтнай формы навучання прэстыжнага факультэта міжнародных адносін БДУ. Не самыя бедныя бацькі, прыстойнае выхаванне. У кампаніі сяброў у Мінску яна паспрабавала «хімію». Памерла праз два дні, не выходзячы з комы. Бацькі, калі ўбачылі цела дачкі, жахнуліся — сінякі, гематомы, збітыя костачкі на руках... На пахаванне прыйшло каля 200 чалавек, ад людскіх слёз магла ўтварыцца рака. «Чаму дачка зрабіла адзіную, але такую вялікую памылку?» — пыталіся ў сябе бацькі і не знаходзілі адказу...

У мінулым месяцы трэцякурснік сталічнага каледжа запрасіў да сябе ў госці 15-гадовую сяброўку. Бацькоў хлопца дома не было (толькі бабуля), пара закрылася ў пакоі. Пакаштавалі «маркі» і... без адзення скочылі з акна шостага паверха. Праз некалькі гадзін хлопец памёр. Дзяўчыне «пашанцавала» — яна засталася жывая з мноствам траўмаў...

Пералік падобных трагедый можна прадоўжыць. Толькі за апошні час ад спайсу, парашкоў, «марак» і іншых псіхатропных рэчываў загінула 7 чалавек. А колькі апынулася на мяжы жыцця і смерці! І гэта не нейкія там наркаманы са стажам, а звычайныя маладыя людзі, нават студэнты-выдатнікі.

Чытаеш крымінальныя зводкі, і робіцца проста жудасна. Днямі ў Мінску вадзіцель «БМВ» у неадэкватным стане здзейсніў ДТЗ, праехаў на высокай хуткасці праз увесь горад, а, калі міліцыя пачала браць яго «ў палон», парэзаў сабе вены. Пазней вадзіцель прызнаўся, што напярэдадні прымаў нейкі белы парашок. І добра яшчэ, што пагоня скончылася без чалавечых ахвяр.

Толькі за тыдзень у чатырох гарадах Беларусі маладыя людзі ад 13 да 17 гадоў патрапілі ў бальніцы ў цяжкім стане пасля ўжывання спайсу! І гэта таксама дзеці з добрых сем'яў, якія займаліся спортам, вялі нармальны лад жыцця. Дык чаму яны робяцца ахвярамі? Вінаваты сем'і, школа? Дзяржава ні пры чым?

Сёння беларускія сілавікі заяўляюць: мы аб'явілі вайну спайсам і іншай наркатычнай дрэні. Праблема ў тым, што ў Беларусі ёсць рэспубліканскі пералік наркатычных, псіхатропных сродкаў, за распаўсюджванне якіх прадугледжваецца крымінальная адказнасць, але пастаянна выводзяцца новыя формулы наркотыкаў. МУС, Мінздраў і Камітэт судмедэкспертыз прапануюць унесці змены ў закон аб наркатычных сродках. І гэта добра. Не зразумела другое: спайсы сталі для іх навіной толькі зараз? Лухта! Загадчык рэабілітацыйнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Уладзімір Іваноў распавядаў, што для беларускай псіхіятрыі рэальная праблема спайсаў пачалася яшчэ два гады таму, а сінтэтычныя канабіноіды вынайшлі яшчэ на пачатку 2000-х. Дык чаму ў Беларусі да гэтага часу няма нармальнага закона? Дзе ж ваша прафілактыка, гульня на апярэджанне? А можа, кагосьці сярод высокіх дзяржаўных асоб задавальняе такое становішча? Бо псіхатропы сёння — гэта магутны бізнес. У той жа Германіі альбо Швецыі дзейнічаюць іншым чынам. Там забараняюць не варыянты наркотыкаў, а асноўнае рэчыва. Што, для нас гэта такая праблема?

Кажуць, што новыя псіхатропы паступаюць у Беларусь у асноўным з Азіі. Але ж для іх правозу, напэўна, не заказваюць чартарныя рэйсы. Ды і навошта, калі ў нас на мяжы з Расіяй дзірка? Адзін беларускі гастарбайтар распавядаў: *«Можна ўзяць у Маскве «наркаты» на 100 долараў, а ў Беларусі прадаць у разы даражэй. Жыць будзеш багата, але, хутчэй за ўсё, не вельмі доўга. Таму адмовіўся».* Але ж многія не адмаўляюцца. І змагацца з такімі трэба не кропкава, а напоўніцу.

Памятаю, некалькі гадоў таму рабіў матэрыял аб праблеме «бубак» (насенне маку, якое свабодна прадавалася ў Беларусі і якое за якія-небудзь 40 хвілін можнаператварыць у наркотык). Пагутарыў з наркаманам са стажам, той распавёў, чаму «бубкі» не забараняюць. *«Там такія грошы круцяцца, такія высокія людзі зацікаўлены ў гэтым, што працэс будуць тармазіць да апошняга»*, — пашчыраваў ён.



Я спачатку не паверыў гэтаму — ці мала што магло намаляваць хворае ўяўленне наркамана! А пасля на адной з прэс-канферэнцый намеснік начальніка ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Аляксандр Гаўрылаў і сам распавёў журналістам, што, каб зрушыць з мёртвай кропкі недасканалае заканадаўства па «бубках», неабходна палітычная воля зверху. Маўляў, сама міліцыя не можа нічога зрабіць. І гэтае ўпраўленне яшчэ ў 2005 годзе пачало ўзнімаць праблему...

А памятаеце, як змагаліся ў 1990-я з валютчыкамі? Пры жаданні іх можна было «ўзяць пад каўпак» у адзін момант. Аднак жа не бралі, а проста раз-пораз рапартавалі аб тым ці іншым выпадку «процістаяння ажыццяўленню незаконных аперацый». Самі валютчыкі пры гэтым смяяліся: *«Ды нам паведамляюць, калі ідзе праверка. За што ж мы тады дзелімся прыбыткам?»*

Днямі ж старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька заявіў, што ў Мінску напярэдадні чэмпіянату свету сіламі органаў унутраных спраў сумесна з падатковай інспекцыяй будзе наведзены парадак у рабоце службаў таксі ў Нацыянальным аэрапорце. Прабачце, але старшыні гарвыканкама і падатковай інспекцыі абавязкова спатрэбіўся чэмпіянат свету, каб зразумець, што ў аэрапорце ўжо гадамі працуюць «нелегалы»?

Адным словам, барацьбу са злом ва ўсіх яго праявах можна толькі вітаць. Галоўнае, каб яна была не для «галачкі». А то, ведаеце, розныя нядобрыя думкі прыходзяць у галаву адносна сумленнасці тых, хто змагаецца з гэтым самым злом.

...Пакуль жа смяротны транзіт псіхатропаў у Беларусь працягваецца. І вядзе ён моладзь напрасткі ў магілу.

Алесь СІВЫ.

ЗАКУЛИСЬЕ

Кто будет строить новую президентскую больницу?

Судя по всему, белорусские власти не отказались от планов строительства в лесном массиве поселка Ждановичи, что под Минском, новой клиники для чиновников. Как стало известно «Народной Воле», свои заявки на участие в возведении этого медицинского объекта подали три компании.



Из истории вопроса

В конце прошлого года стало известно о планах властей построить к маю 2016 года под Минском новую больницу и оснастить ее современным медицинским оборудованием. То, что планируется строительство спецбольницы, а не медучреждения для простых смертных, говорил тот факт, что заявка на официальный сайт госзакупок на выполнение работ по строительству поступила от Главного управления капитального строительства Управления делами президента. Строительством рядовой больницы это ведомство вряд ли занималось бы. Сами за себя говорили и требования, которые выдвигал заказчик к строительной организации. Это создание в медцентре отделений по аналогии с теми, которые есть в нынешней так называемой лечкомиссии, оснащение клиники новейшим оборудованием и главное — наличие не просто VIP-палат, а целого блока для высокопоставленных пациентов с отдельным входом. Все принятые технические решения строящая организация обязана согласовывать со Службой безопасности.

Приблизительная стоимость объекта — **100 миллионов евро.**

Правда, стоит отметить, что из госбюджета на строительство медцентра планируется выделить только 15% от его стоимости, остальные средства исполнителю предложено найти самому путем привлечения долгосрочных иностранных кредитов.





Белорусская «кремлевка» сегодня занимает несколько корпусов. Неужели не хватает? Может, надо не площади расширять, а количество чиновников сокращать?

Как будут возвращаться вложенные деньги? Скорее всего за счет платных услуг, которые будут организованы в клинике. Если оборудование самое новейшее, то и медицинская помощь и диагностика самые современные. Только вот вряд ли чиновники, для которых новую больницу и строят, будут платить за лечение и обследование на новейших аппаратах МРТ, УЗИ и т.д. Платные услуги — для всех остальных, для простого народа. И для иностранцев, которых в наших больницах принимают вне очереди, потому что они оплачивают услуги валютой.

Но кто же вступил в борьбу за тендер на строительство новой клиники под Минском?

С подмоченной репутацией

До настоящего времени при реконструкции и строительстве медицинских объектов Беларусь обходилась своими силами. Однако новую больницу специального назначения вряд ли будут возводить белорусские строительные компании. Участие в тендере приняли три фирмы: две австрийские — **«Vamed»** и **«Moser»** и турецкая компания **«Emsas».**

В Беларуси широко известна только последняя компания, она присутствует на нашем рынке с начала 2000-х годов. Совпадение это или нет, но «Emsas» уже выигрывала тендеры на реконструкцию объектов, которые принадлежат Администрации президента. В разные годы «Emsas» реконструировала отель «Минск», гостиницу «Октябрьская», которая стала «Президент-отелем».

Наверняка у заказчика новой президентской клиники немало вопросов должно возникнуть к конкуренту «Emsas» — австрийской компании «Vamed». Она позиционирует себя как один из мировых лидеров среди инженерно-технических и генподрядных организаций, работающих в сфере здравоохранения. С 1982 года «Vamed» занимается реконструкциями, строительством и оснащением больниц и клиник. Основной рынок ее услуг — страны Европы, где, судя по отзывам в интернете, вопросов к работе компании не возникало. Возможно, потому, что в цивилизованных странах слова *«чиновник»* и *«коррупция»* — не синонимы.

Но с конца 1990-х — начала 2000 годов «Vamed» появился на рынке СНГ и стал успешно завоевывать в первую очередь российский рынок, если быть точнее — российскую глубинку: «Vamed» получил заказы на строительство медицинских центров в Якутии, Краснодаре, Татарстане. В 2008 году «Vamed» вышел на украинский рынок. Сначала компания выполняла проектные работы для частных медучреждений, а в 2009 году на ней остановил свой выбор Минздрав Украины. И случился громкий скандал.

«Vamed» поставил Украине 1000 машин «скорой помощи» на сумму 100 млн евро, в которые... не помещались носилки. *«Тогда пост премьер-министра занимала Юлия Тимошенко*, — писало в прошлом году авторитетное издание «News». — *Для Украины, население которой составляет почти 50 миллионов, тысяча машин «скорой помощи» не было большим количеством. Поскольку Тимошенко пользовалась на тот момент большой поддержкой населения, выделить на эти цели 100 млн евро не составило большого труда.*

То, что Украина получила через несколько месяцев, не было отличными машинами «скорой помощи», то были небольшие белые автомобили с оранжевой полосой... Помимо прочего, они были слишком маленькие для того, чтобы в них помещались носилки, на которых пациент мог бы транспортироваться в лежачем положении. О том, что произошло между заказом и поставкой, идет много разговоров. Диагноз украинских газет однозначен и безрадостен — это дело с сильным душком... В Украине до сих пор проводится расследование по этому делу. Но что случилось с 1000 белых автомобилей «Опель Комбо», так никому и не известно». Журнал «News» не дает прямых оценок, но между строк явно читается: «Vamed» согласился на сомнительную сделку, которую лоббировали коррумпированные чиновники Украины и скорее всего не без выгоды для себя.

Теперь «Vamed» пытается выйти на белорусский рынок и сразу же включиться в проект Управления делами президента. Где гарантия, что и у нас не случится скандал, как в Украине, где австрийская компания имела контракт с государством?

В списке претендентов на строительство новой «лечкомиссии» есть еще одна австрийская компания — **«Moser Architekten Ziviltechniker GmbH».** Но о ней в Беларуси мало что известно. Разве только то, что архитекторы этой компании разработали концепцию «Минских башен» на пересечении проспекта Независимости и улицы Филимонова. Этот комплекс небоскребов должны были начать возводить еще в 2010 году, но до сих пор ясности с этим проектом нет. Недавно территорию огородили, якобы там начались подготовительные работы. Но австрийская фирма в этом проекте не участвует.

ГЛАС НАРОДА

А собственно, нужна ли сегодня стране новая больница для чиновников? Мы решили поинтересоваться мнением горожан: что они думают по поводу строительства нового Клинического медицинского центра Управления делами президента?

Инна Таран, бухгалтер:

— Новые современные клиники, безусловно, Минску нужны. Недавно навещала коллегу в отделении пульмонологии 10-й больницы и ужаснулась: больные с воспалением легких лежат в коридоре, палаты переполнены — по 6—8 человек, дышать нечем. И это больные пневмонией!..

Но я категорически против того, чтобы новые клиники строили для избранных. Не должно быть привилегий у чиновников, министров, депутатов. Если бы высокопоставленных чиновников лишили обслуживания в лечкомиссии, быстрее навели бы порядок в обычных поликлиниках и больницах.

Юрий Козловский, водитель:

— Мое мнение: новая «лечкомиссия» не нужна, нынешней более чем достаточно. А если у нас чиновники все такие больные, тогда им всем пора на пенсию.

Анна Томкович, переводчица:

— На мой взгляд, новые клиники Беларуси не помешают. Будь они общегосударственные, или ведомственные, или частные. Если у богатого ведомства типа Белорусской железной дороги есть хорошая прибыль, из которой оно возьмет средства на строительство такого объекта, пусть строит. Или, например, нашлись инвесторы, построили частную клинику — почему бы и нет? Там тарифы будут для всех одинаковые, сможешь заплатить — лечись. Все остальное — обман народа и создание за его счет привилегий для правящей верхушки.

Галина Юрцевич, пенсионерка:

— В прошлом году я стала бабушкой. Внучка родилась недоношенной, дочь долго лежала с ней в РНПЦ «Мать и дитя». Врачи там от Бога, низкий им поклон! А вот условия... Казалось бы, главное учреждение страны такого профиля, но там даже нет помещения, где бы мамы могли сцеживать молоко, где бы специалисты учили их навыкам, как потом дома справляться с недоношенными крошками и т.п. Врачи говорят, что уже давно есть проект нового корпуса этой больницы, где все это предусмотрено, но строительство почему-то откладывается. Видимо, кто-то решил, что важнее строить новую лечкомиссию, чем корпус для новорожденных...

Юрий Пилецкий, программист:

— Вы говорите, что это только планы. А в нашей стране много чего планируется построить, а в последний момент принимается иное решение. Я не совсем верю такой информации. В следующем году в Беларуси президентские выборы, и вряд ли решение построить новую больницу для чиновников добавит рейтинга Александру Лукашенко. Разве что он сделает хитрый ход, как это было с новой 2-й больницей. Сначала объявят, что это будет новая «лечкомиссия», а потом Александр Лукашенко отдаст ее городу Минску. Очень мудрый ход с точки зрения пиара.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

НОВЫЯ ІМЁНЫ

13-гадовы гітарыст скарыў мінскую публіку

Вучань сталічнай дзіцячай музычнай школы мастацтваў №10 імя Глебава Аляксей Пракапенка ўзяў Гран-пры Мінскага гарадскога адкрытага конкурсу юных выканаўцаў на класічнай гітары.



Конкурс праводзіцца раз у тры гады ў дзвюх намінацыях: «Выканаўцы-салісты» і «Ансамблі». Узроставыя катэгорыі тры — да 11, да 13 і да 16 гадоў. Удзельнічаюць не толькі музыканты з Мінска, але і прадстаўнікі рэгіёнаў. Канкурсанты выконваюць творы вядомых кампазітараў (па выбары), а таксама абавязковыя творы. Спецыяльна да сёлетняга конкурсу яны былі напісаны беларускімі кампазітарамі **Святланай Ветушка, Ігарам Кузьміцкім, Валерыем Жывалеўскім**.

Аляксей Пракапенка ўзяў першую ўзнагароду ў намінацыі «Выканаўцы-салісты» ва ўзроставай катэгорыі да 13 гадоў. У творчай біяграфіі падлетка нямала дасягненняў. Ён стаў пераможцам шматлікіх музычных конкурсаў, стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Аляксей іграе на балалайцы, гітары і фартэпіяна.

«Жыга «Пыркі расы» ў апрацоўцы Дэвіда Расэла, якую выканаў Аляксей, — твор, які не кожны студэнт Акадэміі музыкі рызыкне прадставіць на конкурсе», — заўважыў сябра журы, старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка **Кірыл Успенскі**.

Іншыя ўзнагароды конкурсу размеркаваліся наступным чынам: першае месца ў намінацыі «Выканаўцы-салісты» (да 11 гадоў) атрымаў **Багдан Гаркавенка**, у той жа намінацыі (узроставая катэгорыя да 13 гадоў) — **Андрэй Давідовіч**. Першае месца ў намінацыі «Ансамблі» (да 11 гадоў) у квартэта мінскай Дзіцячай музычнай школы мастацтваў №8 імя Р.Шырмы, у катэгорыі да 16 гадоў — у Светлагорскай дзіцячай школы мастацтваў.

Марыя БУДНІК.

ПРОДАНО!

Пустой участок по цене двухкомнатной квартиры

Минчане готовы выкладывать такие деньги за землю. Это показал недавний аукцион в Минском райисполкоме.

Участникам торгов были предложены 15 лотов в различных сельсоветах. Самые ближние к Минску участки находились в деревне Копище, что рядом с Уручьем. При начальной цене 390 млн рублей они будут проданы за 759,9 млн и 570 млн рублей (77.079 и 57.809 долларов).

Еще большим спросом пользовались три лота в деревне Лесковка, что недалеко от Боровлян. Торги за них вели 17—19 человек. Участки будут проданы за 610, 621 и 909 миллионов рублей (61.866, 63.023 и 92.272 долларов).

Участки в деревне Крылово (возле одноименного водохранилища) взяли за 310 и 365 млн рублей (31.511 и 37.018 долларов). 16 соток в деревне Глебковичи возле Колодищей достанутся победителю торгов за 263,6 млн рублей (26.770 дол.), 15 соток в Липовой Колоде — за 279,9 млн рублей (28. 388 дол.), сообщает realt.onliner.by.

Лошанский сельсовет (молодечненское направление) выставил на торги два лота — участки в деревне Бровки и поселке Селец. Первый ушел с молотка за 160 млн рублей (16.309 дол.), второй — за 67 млн рублей (6805 дол.).

Нашли своих обладателей и два участка площадью 13 соток в Щитомиричах близ Сенницы (4-й км от МКАД). Один будет продан за 226 млн рублей (22.920 дол.), второй — за 180 млн рублей (18.255 дол.).

КОНКУРС

9 мільёнаў за білет

Нацыянальны мастацкі музей Беларусі праводзіць конкурс на лепшы дызайн уваходнага білета.

Пераможца атрымае 9 мільёнаў беларускіх рублёў (у 2013 годзе аўтара лепшага дызайну прэміравалі 4 мільёнамі). У два разы павялічыўся і прыз глядацкіх сімпатый — 4 мільёны.

Прыняць удзел у конкурсе могуць усе жадаючыя, у тым ліку дызайнеры, мастакі, студэнты з Беларусі ці замежжа, якія дасягнулі 18 гадоў. Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце музея.

Імя пераможцы абвесцяць 24 красавіка.

РЭГІЁНЫ

Калі важна быць на сувязі…

Выратавальнікі здолелі захаваць жыццё пенсіянеру, які праваліўся ў калодзеж, дзякуючы таму, што ён патэлефанаваў сваёй жонцы.

Пачалося ўсё з таго, што жыхар Ляхавіцкага раёна вырашыў пачысціць свой калодзеж. Але выпадкова праваліўся ў яго і самастойна выбрацца не змог. Мужчына тут жа набраў па мабільным нумар сваёй жонкі, а яна патэлефанавала ў МНС. Выратавальнікі хутка дасталі пенсіянера з сяміметровай студні. Жыццю мужчыны нічога не пагражае.

Небяспечная гульня

У Пінску засыпала двух падлеткаў, якія рылі тунэль у кар'еры. Адзін з іх у коме.

Паведамленне аб тым, што ў кар'еры засыпала двух чалавек, паступіла выратавальнікам вечарам у нядзелю. Пакуль да месца здарэння спяшаліся падраздзяленні МНС, адзін з трох падлеткаў, што капалі тунэль, адкапаў аднаго з сябраў. Хлопец хутка прыйшоў да прытомнасці і не меў патрэбы ў медыцынскай дапамозе.

Усяго праз некалькі хвілін выратавальнікі дасталі другога хлопца. Пацярпелага даставілі ў рэанімацыйнае аддзяленне. Стан маладога чалавека вельмі цяжкі, ён знаходзіцца ў коме.

Марыя МАЛЕВІЧ.

СІТУАЦЫЯ

Міхась Кукабака хоча ведаць, як савецкая медыцына зрабіла яго вар'ятам

Міхась Ігнатавіч Кукабака — чалавек у вузкіх колах вельмі вядомы. Праваабаронца яшчэ з савецкіх часоў, аўтар публіцыстычных матэрыялаў, якія ў 1970—1980-я гады распаўсюджваліся праз самвыдат і замежныя радыёстанцы; шматразовы палітычны вязень. Нарадзіўся ў Бабруйску. Бацька загінуў падчас савецка-фінскай вайны ў 1939-м, маці памерла ў 1947 годзе. У выніку рос і выхоўваўся ў дзіцячым прытулку.

У жніўні 1968-га Міхася Кукабаку выклікалі ў ваенкамат, а ён заявіў: «Калі накіруеце ў Чэхаславакію, павярну аўтамат супраць вас. Саўдзельнікам злачынства савецкага ўрада не буду, выступлю на баку чэхаславацкага народа». Вось з гэтага і пачалася біяграфія савецкага дысідэнта...



«У мяне была звычайная біяграфія звычайнага, простага чалавека, — расказваў Міхась Ігнатавіч. — *Мае погляды фарміраваліся выключна на аснове асабістага досведу. Я не слухаў замежныя перадачы, не чытаў самвыдатаўскай літаратуры, нават не ведаў, што такая ўвогуле існуе. Таму маё грамадзянскае „сталенне« праходзіла даволі павольна... Я... толькі дзесьці на мяжы свайго 30-годдзя пачаў сур'ёзна раздумваць аб рэвалюцыі і яе выніках, аб тым, у імя якой будучыні краіна забрала мільёны жыццяў...»*

Карная псіхіятрыя ў тыя часы, як вядома, была справай распаўсюджанай. Лічылася, што толькі вар'ятам не падабаецца савецкая ўлада. Вось так і атрымалася, што КДБ накіраваў Кукабаку ў сумна вядомы Інстытут імя Сербскага ў Маскве. Потым, збегшы на Захад, доктар Валашановіч, які і «лячыў» дысідэнта Кукабаку, засведчыў, што ўсё рабілася па ўказанні КДБ, што Кукабака цалкам здаровы. Але дакументальна аднавіць тыя падзеі Міхась Ігнатавіч не можа да сённяшняга дня, хаця ўжо даўно рэабілітаваны.

І вось у студзені, нарэшце, прыйшла радасная вестка: з расійскага Міністэрства аховы здароўя Кукабаку паведамілі, што ягоная судова-псіхіятрычная экспертыза рассакрэчана. Але радаваўся былы палітвязень нядоўга. Бо следам было накіравана іншае паведамленне, у якім Міністэрства аховы здароўя паведамляла, што Цэнтр імя У.П.Сербскага, у архівах якога захоўваюцца матэрыялы, што цікавяць Міхася Кукабаку, не можа даць яму запытаныя звесткі. Тлумачыцца гэта тым, што экспертныя заключэнні з'яўляюцца часткай матэрыялаў крымінальнай справы і выдаваць копіі такіх заключэнняў, знаёміць з імі грамадзян супрацоўнікі судова-экспертнай установы не маюць права.

Такім чынам Кукабаку не збіраюцца разгалошваць метады, якімі спрабавалі абвясціць яго вар'ятам 44 гады таму. На што ён, канешне, паспадзяваўся, атрымаўшы нечакана для сябе першае апавяшчэнне з Міністэрства аховы здароўя ад 23 студзеня 2014 года, у якім нехта А.П.Данілеўскі паведаміў пра зняцце грыфа сакрэтнасці з яго гісторыяй хваробы за 1970, 1979 і 1982 гады камісіяй навуковага цэнтра сацыяльнай і судовай псіхіятрыі імя У.П.Сербскага.

«Прачытаўшы такое, амаль любы на маім месцы падумаў бы, што мэта дасягнута, — распавядае Міхась Ігнатавіч. — *Мы з адвакатам вырашылі не звяртацца адразу для азнаямлення, а спачатку высветліць, як праходзіў працэс «рассакрэчвання». Адправілі запыт у гэты «псіхінстытут» 18 лютага. І адначасова я атрымаў адказ з Міністэрства аховы здароўя за подпісам чыноўніка Кавалёва, які пацвердзіў рассакрэчванне, але адмовіў у азнаямленні з архівам».* Адказ Міністэрства аховы здароўя ад 7 сакавіка пацвердзіў гэтую адмову.

Дарэчы, чыноўнік Кавалёў адсылае Міхася Кукабаку з просьбай пра азнаямленне з матэрыяламі экспертыз да праваахоўных органаў. У адказ на гэта «антысаветчык» абураецца: *«Але ж я цяжбу з імі вяду з 2006 года! І ад усіх «праваахоўнікаў» і судоў атрымліваў адмовы. Маю ж «крымінальную» справу ў 1970 годзе вёў начальнік следчай часткі УКДБ па Уладзімірскай вобласці маёр КДБ Павел Яўсееў. І паводле яго распараджэння яна была засакрэчана. А сёння, праз 44 гады, яны ўсе ад гэтай справы і ад мяне адхрышчваюцца».*

На думку савецкага дысідэнта і чатырохразовага палітвязня, для цяперашніх спецслужбаў ён «вельмі непрыемны кліент» з розных прычын. *«Па-першае, цалкам рэабілітаваны. Але калі з майго боку не было складу злачынства, значыць, іх «следчыя дзеянні» з'яўляюцца юрыдычна нікчэмнымі. Дакладней — злачыннымі. Паколькі пацягнулі за сабою шэсць гадоў пазбаўлення волі (з 1970-га па 1976 год па першай крымінальнай справе. Па-другое, ім нават прысніцца не магло, што амаль праз 40 гадоў я буду настойліва дамагацца высвятлення ісціны. Хутчэй за ўсё, разлічвалі, што ўвогуле не дажыву. І ўжо тым больш КДБ не «марыў» пра перабудову».*

Яшчэ ў 1991 годзе Міхась Кукабака быў рэабілітаваны па ўсіх абвінавачваннях. Першую спробу дамагчыся азнаямлення з заключэннем судова-псіхіятрычных экспертыз ён зрабіў у 2006 годзе, але безвынікова. На працягу сямі наступных гадоў з усіх дзяржаўных устаноў і судоў ён атрымлівае адмовы. Такім чынам, атрымліваецца, што назва дзяржавы за гэтыя часы змянілася, а вось сутнасць сістэмы гэтай дзяржавы, дзе з чалавекам можна рабіць што заўгодна, засталася ранейшай.

Ігар МАРОЗАЎ.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Бульба і таўкачы не змаглі памагчы

Настаўнік фізікі з Гродзенскага раёна зрабіў гальванічны элемент, змясціўшы паміж цынкавай і меднай пласцінамі тоўчаную бульбу. Электраэнергіі, выпрацаванай з пюрэ, хапіла аж на два тыдні работы святлодыёднай лямпы.

...У Беларусі амаль удвая падаражала бульба.

Усіх усцешыла навіна:
Нам лёс збавенне падарыў,
Бо ў энергетыцы краіна
Зрабіць павінная прарыў.
Каб быў наш родны край
багатым,
Каб у пазыкі ўрад не лез,
Не трэба болей «мірны атам»,
Не трэба будаваць АЭС!
Не будзем асушаць балоты,
Каб пераводзіць торф на ток.
Экалагічныя турботы
Не будуць нам вярэдзіць клёк.
Перад Расіяй больш не станем
З працягнутай рукой па газ,
І за сабой, як на аркане,
Яна цягнуць не будзе нас.
Заводы ажывуць адразу,
Так запрацуюць — будзь здароў!
БЕЛАЗу, МТЗ і МАЗу
Нібы ўвальюць другую кроў.
Нас не настрашыш халадамі
Сярод сцюдзёнае зімы.
Энергію буржуям самі
За еўра прадавацьмем мы.
Якая ж манна ўпала з неба,
Хто гэткі куш для ўсіх прынёс,
Што нам цяпер ужо не трэба
Турбоціцца пра ўласны лёс?
Не з нобелеўскім лаўрэатам
Даб'ёмся заўтра перамог,
А зробіць родны край багатым
Звычайны школьны педагог.
Карпеў начамі ў кабінеце,
Хацеў разбіць навуку ўшчэнт:
Не вечны рухавік на мэце,
А гальванічны элемент.
Спачатку рэзультатам нуль быў —
Хоць ты ад роспачы заплач.
А потым наварыў ён бульбы
І дзедаўскі дастаў таўкач.
Любіў ён бульбу на вячэру,
Прычым не цалкам, а пюрэ:
Яму, амаль пенсіянеру,
Пюрэ не так гарляк дзярэ.
Магчыма, што былі прычыны,
І педагог ужыў каньяк...
Ляжалі на стале пласціны,
І паміж імі ўпаў камяк.
Адразу лямпачка заззяла,
І вельмі яркае святло!
(Раней святло было, ды мала,
І задаволіць не магло).
Усклікнуў ён з такой нагоды,
Як колісь слаўны Архімед:
— Цяпер яны, караняплоды,
Святлом зальюць, азораць свет!
Вось гэтак педагог вясковы
Зрабіў на бульбе адкрыццё.
Мы ўкараніць былі гатовы,
Яго ўвасобіць у жыццё.
Мы марылі на ўзнёслай хвалі:
Нам бульба зможа памагчы!
Усім кагалам рыхтавалі
І чыгуны, і таўкачы.
Ужо кляпаліся дыёды —
І на патрэбы, і ў запас,
І ўсе астатнія народы
Глядзелі з зайздрасцю на нас.
Аднак, на жаль, праблема
ўзнікла
Адбыўся раптам нейкі збой
(Для нас жа мецъ праблемы —
звыкла
У справе кожнай і любой).
Праект, так мовіць бы, кульгае,
Сябе мы цешылі дарма:
Адно, што бульба дарагая,
Другое — што яе няма...

ПАЗІЦЫЯ

Што ж гэта за дэпутаты, якіх не хвалюе лёс беларускай мовы?

Мяне, як і многіх беларусаў, непакоіць гаротны стан роднай мовы. Хоць афіцыйна яна з'яўляецца дзяржаўнай, але тыя ж чыноўнікі пагарджаюць ёю на кожным кроку. Пра гэта сведчыць і мой зварот да дэпутата Палаты прадстаўнікоў ад Маладзечанскай сельскай выбарчай акругі №73 **Станіслава Кулеша.** Я двойчы прасіў яго ініцыяваць разгляд праекта закона *«Аб дзяржаўнай падтрымцы беларускай мовы»,* які быў распрацаваны і накіраваны ў парламент грамадскім аб'яднаннем «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны». Думаеце, ён адгукнуўся на маю прапанову? Зрабіў выгляд, што гэта не яго справа. Нават не выступіў на пленарным пасяджэнні і не акрэсліў праблему. Адным словам, праігнараваў маю просьбу.

На пачатку сакавіка я звярнуўся да старшыні Палаты прадстаўнікоў **Уладзіміра Андрэйчанкі,** з тым каб ён мне растлумачыў, чаго варты дэпутат, які не можа скарыстацца канстытуцыйным правам заканадаўчай ініцыятывы, не можа выступіць у Палаце прадстаўнікоў і прыцягнуць увагу ўсіх парламентарыяў да звышважнай праблемы.



Некалькі дзён таму атрымаў адказ і вельмі здзівіўся. Цытую: *«Ажыццяўляючы сваю дэпутацкую дзейнасць, у тым ліку ў Палаце прадстаўнікоў*, *дэпутат кіруецца* ***сваімі перакананнямі і меркаваннем,*** *улічваючы эканамічныя і сацыяльныя магчымасці дзяржавы»*. Самая звычайная адпіска! А я лічыў, што дэпутат павінен кіравацца ў першую чаргу інтарэсамі выбаршчыкаў.

Скажыце, дзеля чаго мы выбіраем дэпутатаў, калі яны так безадказна ставяцца да лёсу роднай мовы? Вось яшчэ адзін узор абыякавасці чыноўнікаў: *«Згодна з артыкулам 6 Закона РБ «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь», усякія прывілеі ці абмежаванні правоў асобы па моўных прыкметах недапушчальныя».* Так, недапушчальныя, але ж дзяржава дала прывілеі адной мове — рускай і абмежавала правы другой — беларускай. Толькі сляпы і глухі гэтага не бачыць і не чуе!

Я хачу чытаць усе законы Рэспублікі Беларусь, дэкрэты і ўказы кіраўніка дзяржавы, пастановы ўрада, рашэнні мясцовых улад па-беларуску. ***Але ж такой магчымасці не маю***. Усе заканадаўчыя і нарматыўныя акты прымаюцца і публікуюцца на адной дзяржаўнай мове — рускай. Чаму ж улада абмежавала маё права як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь?

Тыя, хто сёння знаходзіцца на вяршыні ўлады, кіруюцца не артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у якім запісана, што дзяржаўнымі мовамі ў краіне з'яўляюцца беларуская і руская мовы, а Законам «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь», які сцвярджае, што ў Беларусі можна ўжываць у дзяржаўным і грамадскім жыцці беларускую або (или) рускую мове. Гэты злучнік «або» (у тым ліку) падзяліў не мовы, а людзей на «чэсных» і «нячэсных», на «правільных» і «адшчапенцаў», на русафобаў і патрыётаў Беларусі, адраджэнцаў беларускасці. У адказе з той жа Палаты прадстаўнікоў чытаю: *«Пытанні развіцця і ўжывання беларускай і рускай моў на тэрыторыі РБ, а таксама пытанні забеспячэння канстытуцыйных правоў грамадзян дастаткова поўна ўрэгуляваны дзеючым заканадаўствам РБ».* Вось так — усё добра. Гэта не ўрэгуляванне, а падзел, раз'яднанне грамадства.

Аляксандр Лукашэнка аднойчы сказаў, што мова не павінна быць палітычнай катэгорыяй (не памятаю даслоўна, але сэнс такі). А на самай справе беларускія ўлады зрабілі ўсё для таго, каб мова стала *«яблоком раздора»*, сродкам палітычнай барацьбы. Агрэсіўная русіфікацыя, ігнараванне на дзяржаўным узроўні беларускай мовы, пераслед грамадзян за прыхільнасць і ўшанаванне нацыянальнай гісторыі, культуры, нацыянальных сімвалаў, святаў — хіба ж гэта нармальная палітыка?

Што рабіць? Набліжаць той час, калі кіраваць краінай будуць свядомыя беларусы, якія будуць ставіцца да роднай мовы з павагай. А пакуль прыслухайцеся да парады майго знакамітага земляка **Вячаслава Рагойшы**: ***«...з сябе пачынай без прынукаў: навучы роднай мове сына, навучы роднай мове ўнука!»***

Міхась СПІРЫДОВІЧ,
сябра Івянецкай суполкі ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны».

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Пяць дзён з... мандатам

Прадстаўнік руху «За Свабоду» **Аляксандр Шчамлёў** з вёскі Амбросавічы Шумілінскага раёна на Віцебшчыне пяць дзён прымаў віншаванні з перамогай на выбарах у сельскі Савет. Але, як высветлілася, святкаваць перамогу было рана.

28 сакавіка яму паказалі новы пратакол і паведамілі, што выбары ён, аказваецца, прайграў. Дэпутатам жа стала завуч Амбросавіцкай сярэдняй школы **Ірына Мацялёнак**.

На вёсцы, з аднаго боку, усё навідавоку, усе пра ўсіх усё ведаюць, але з другога — праўды дабіцца ўсё роўна вельмі цяжка.

Аляксандр Шчамлёў распавёў "Народнай Волі", што ў дзень выбараў, 23 сакавіка, сваімі вачыма бачыў пратакол, згодна з якім ён набраў на 14 галасоў болей, чым Ірына Мацялёнак. Ды і не толькі ён гэта бачыў, бо камісія паводзіла сябе досыць дэмакратычна. Праўда, копію пратакола яму не далі і здымаць дакумент на фота камісія забараніла.

— Калі б я ведаў, што так можа здарыцца, то настаяў бы на сваім, — расказвае Шчамлёў, які пяць дзён "пабыў" дэпутатам. *— Але мне сказалі, што не пажадана фатаграфаваць. Ну, я і пагадзіўся. Тым больш што калі лічылі бюлетэні, то не хаваліся, усё было бачна. Склалі такія стопачкі, на іх паперкі клалі, усё агучвалі. Ну, дэмакратыя як мае быць! Я сам пры ўсім гэтым прысутнічаў, усё чуў і бачыў і нават не здзівіўся, калі мне пратакол паказалі. У нас акруга маленькая, так што вынікі галасавання, якія былі зафіксаваны ў першым пратаколе, я добра памятаю. Бюлетэні атрымалі 47 чалавек: 18 прагаласавалі датэрмінова і 29 — у дзень выбараў. З 18 «датэрміновых» галасоў за мяне было 10, за Ірыну Мацялёнак — 8. Са скрыняй у нас па дамах не хадзілі, так што, паводле агульных падлікаў, у дзень галасавання 4 чалавекі прагаласавалі супраць усіх, 27— за мяне, 13 — за маю саперніцу, несапраўдных бюлетэняў было 3. Дарэчы, я ж сам збіраў подпісы за сваё вылучэнне, і 27 чалавек чэсна сказалі, што будуць галасаваць за мяне, так што такі вынік мяне не здзівіў нават.*

Калі ж яго паклікалі і паказалі новы пратакол, то абурэнню Шчамлёва не было межаў.

— Атрымалі бюлетэні, аказваецца, ужо не 47, а 49 выбаршчыкаў. Ажно 19 бюлетэняў прызнаны несапраўднымі! Паводле новага разліку, ужо пяць чалавек галасавалі супраць усіх, 12 — за мяне і 13 — за завуча. Карацей, цэлая вуліца народу — такія дурні, што не ведалі, як правільна галасаваць, і проста папсавалі бюлетэні. Гэта што такое?! — абураецца Шчамлёў.

Вясковец, які не стаў дэпутатам, працягвае:

— Мне казалі, што сябраў камісіі пачалі цягаць да раённага начальства. Дый у камісіі былі простыя людзі — бібліятэкарка наша, вадзіцель... Што і каму яны маглі запярэчыць? Вось праз пяць дзён і з'явіўся новы пратакол. Мяне больш за ўсё ўразіла, што нават на такіх дробных выбарах — у сельсавет — робіцца такая вялікая хлусня. Навошта?! Што такое сёння сельсавет? Гэта сцяг, герб, стол і пячатка. І больш нічога! Мне падаецца, што прычына нават не ў тым, што я маю дачыненне да руху "За свабоду", — папросту нашы вельмі хацелі дагадзіць мясцоваму кіраўніцтву, вось і перагнулі палку. А людзей у нас няшмат, так што зараз пра гэты выпадак размовы ідуць. Усе ўсё разумеюць. Карацей, аўтарытэту ўладзе гэта ніяк не дадало. Дый мне не нашкодзіла, бо для мяне гэтыя выбары як праверка: хацеў даведацца, што ў нас — аўтарытарызм ці таталітарызм. Вось даведаўся...

Што да сваёй канкурэнткі, завуча мясцовай школы **Ірыны Мацялёнак,** то Аляксандр кажа толькі адно:

— Які ўзровень даверу ў людзей да такой дэпутаткі, самі разумееце. Тут жа ўсё навідавоку, не схаваешся. І, напэўна, людзі не хацелі за яе галасаваць, калі спатрэбіліся такія дзівосы.

"Народная Воля" паспрабавала задаць пытанні старшыні выбарчай камісіі, дзе здарылася гэтая прыкрая гісторыя, — дырэктару мясцовай школы **Еве Ласянковай.** Прычым нашы спробы заслугоўваюць таго, каб іх апісаць.

Цягам дня сакратар адказвала, што дырэктар на занятках. На перапынках застаць у кабінеце таксама не ўдавалася. Датэлефанаваліся на вахту. Там дзяжурная запісала нумар журналіста і запэўніла, што абавязкова перадасць яго дырэктару, як толькі яе ўбачыць. Нарэшце сакратар у прыёмнай паведаміла нам, што спадарыню Ласянкову шукаць ужо бессэнсоўна, бо яна з'ехала ў Шуміліна, у аддзел адукацыі.

Мы, праўда, датэлефанаваліся і ў аддзел адукацыі. Там, аднак, нямала здзівіліся нашай дасведчанасці. Аказалася, што дырэктара Амбросавіцкай школы ў раёне не чакаюць, чаго і да каго яна можа ехаць, не ведаюць, бо *"з раніцы яна прыязджаць не збіралася"*.

Мабільны (а яго мы таксама знайшлі) жанчына адключыла. Чаму старшыня камісіі не захацела размаўляць з журналістам? Што яе збянтэжыла? Спадзяёмся, Ева Ласянкова з цягам часу патэлефануе ў рэдакцыю "Народнай Волі" і адкажа на нашы пытанні.

Любоў ЛУНЁВА.

МНЕНИЕ

Нужны две-три мощные партии

В общественном мнении все более укрепляется убеждение, основывающееся на мировом опыте, что наличие политической оппозиции и создаваемая ею состязательность в борьбе за власть благоприятны для общества. Как-то при назначении новых чиновников на должности А.Лукашенко намекнул, что в Беларуси нужна мощная политическая партия. Что бы это означало? А то, что приближаются очередные президентские выборы и, известное дело, должна быть провластная партия.

Я же считаю, что в стране необходимо иметь не одну, а две или три сильные партии. Но при этом нужно упорядочить и Конституцию. Президент должен избираться не на пожизненный срок, а только на два срока и не более. И избираться как кандидат от той или иной партии.

А что имеем сегодня? На бумаге у нас более десяти политических партий. Но все они малочисленны, а потому не могут претендовать на власть. Поэтому, повторяю, нужны две-три мощные партии, которые будут состязаться между собой и на демократической основе приходить к власти. Почему Англия на протяжении 350 лет не знает случаев насильственного свержения власти? Это в значительной мере обусловлено формами и нормами, которые регулируют взаимоотношения правящей партии и оппозиции. Эти формы и нормы составляют то, что называется политической культурой. Задача овладения ею актуальна и для нашего общества.

Возьмем, например, опыт США. Республиканская и Демократическая партии, обладающие реальными альтернативными представлениями о способах совершенствования американского общества, никогда не подвергали сомнению фундаментальный социально-политический выбор нации, закрепленный в федеральной конституции. Ненасильственный приход к власти в любом обществе возможен при определенном согласии между главными политическими силами в отношении национальных ценностей.

Возможно, кто-то скажет: оппозиция у нас слабая, издержки в ее развитии неизбежны, стоит ли сейчас критиковать ее? Я думаю, что стоит. По той причине, что с развитием оппозиции, альтернативных политических течений мы связываем особые надежды на преодоление недостатков и пороков ее лидеров. Мы не вырвемся из несвободы, если не соединим борьбу за демократию с обретением политической культуры.

В ситуации глубокого политического кризиса усилия всех слоев и групп нации, в том числе власти и оппозиции, должны быть направлены на разработку и реализацию подлинно научных, конструктивных и, безусловно, ненасильственных, то есть неосуществимых без социального и политического консенсуса, способов построения гуманного демократического общества.

А что мы имеем сейчас? Открытое попрание Конституции. Нет конкуренции политических партий между собой за политическую власть в стране.

Александр ЗАРЕНОК.
г.Калинковичи.

Ці сталі дэпутатамі кандыдаты-багацеі?

Гэта мы вырашылі праверыць па выніках выбараў у беларускай сталіцы.

Самым багатым кандыдатам у дэпутаты ў Мінску быў прадстаўнік Ліберальна-дэмакратычнай партыі, індывідуальны прадпрымальнік **Андрэй Ратасеп**. Яго гадавы даход за 2013 год склаў 4 мільярды 305 мільёнаў 247 тысяч рублёў.

Спадар Ратасеп гандлюе бытавой тэхнікай і спартыўнымі таварамі, асабістым прыкладам абвяргаючы тэзіс пра дрэннае жыццё ІП у беларускай рэчаіснасці. Выбаршчыкам гэта не вельмі спадабалася. Спадар Ратасеп дэпутатам не стаў.

На другім месцы па даходах аказаўся **Міхаіл Макаранка**. Ён узначальвае спецыялізаванае ўпраўленне №68 ААТ "Будаўнічы трэст №4". Міхаіл Пятровіч атрымаў у мінулым годзе 1 мільярд 203 мільёны 338 тысяч 924 рублі. Але нашы людзі, як высветлілася, даверыліся чалавеку, месячны даход якога склаў больш за 11 тысяч долараў у месяц. Напэўна, гледзячы на суму задэклараванага даходу, яны не здолелі ўбачыць сувязь паміж коштамі новых кватэр і заробкамі будаўнікоў-начальнікаў. Такім чынам, Міхаілу Макаранку даверана бараніць інтарэсы простых людзей як кандыдату ад Ясенінскай выбарчай акругі.

Трэцяе месца (праўда, з вялікім адрывам) у рэйтынгу багацеяў, якія захацелі бараніць інтарэсы народа, займаў **Сяргей Казлоў**, гендырэктар комплексу "Алімпійскі", прадстаўнік Сацыяльна-спартыўнай партыі. Ягоны даход за 2013 год склаў 634 мільёны 740 тысяч рублёў. І навуковая супольнасць, прадстаўнікі якой жывуць на тэрыторыі Акадэмічнай акругі, дзе балатаваўся спадар Казлоў, згодна з афіцыйным пратаколам, аддалі яму свае галасы. І не пазайздросцілі, добра ведаючы, што нават акадэмікі сёння пра такія даходы і не мараць. Во якія нашы людзі!

Дырэктар Мінскага холадакамбіната №2 **Аляксандр Рубінаў** — той самы чалавек, заробак якога ўкладаецца ў цэны на прадукты харчавання, аказаўся на чацвёртым месцы. Прадпрыемства, якое ён узначальвае, выпускае марозіва, пельмені, торты, напіткі. Даход дырэктара за мінулы год склаў больш за 549 мільёнаў рублёў, ці ў сярэднім 5 тысяч долараў у месяц. Аляксандр Рубінаў таксама абраны дэпутатам.

Пятае месца ў рэйтынгу займала прадстаўніца ліберал-дэмакратаў **Наталля Башура**. Часова беспрацоўная, яна задэкларавала больш за 520 мільёнаў рублёў гадавога даходу. І выбаршчыкі Наталлі не паверылі. Бо хаця б у тое, што грошы з неба валяцца, нашы людзі дакладна не вераць.

Ірына МАЛЬЦАВА.

ПРАПАНУЮ!

Людзьмі звацца

У нашай роднай Беларусі ўзніклі складанасці з Беларускай Нацыянальнай Ідэяй. У сувязі з гэтым даводжу свае думкі па гэтым пытанні.

Беларускае грамадства (беларуская нацыя) аб'ядноўвае людзей шматлікіх нацыянальнасцяў. Гэта і тое, што беларускае грамадства яшчэ досыць савецкае, не дазваляе станоўча ўспрыняць Беларускую Нацыянальную Ідэю, падмуркам якой з'яўляецца менавіта беларуская аўтэнтычнасць.

Ды і ўлада спекулюе на «нацыяналізме», «нацызме», «фашызме». У выніку ўжо шмат часу мы, беларусы, застаемся без Беларускай Нацыянальнай Ідэі. Таму мая прапанова — узяць за Беларускую Нацыянальную Ідэю шматвяковую мару беларусаў «людзьмі звацца».

Гэта значыць знайсці ў сабе імкненне да ўвасаблення ў жыцці гэтай цудоўнай, але ўсё яшчэ мары. Беларуская нацыя сёння пакутуе ад нахабства беларускага чынавенства, якое часта размаўляе з народам, як са статкам, што амаральна. Амаральнасць нельга «адмяніць» праз рэферэндум. Таму і неабходна векавую мару беларусаў ператварыць у прыцягальную для шматнацыянальнай беларускай нацыі Ідэю.

Імкненнем да чалавечай годнасці стане беларуская маральная рэвалюцыя, якая зменіць наш усё яшчэ савецкі менталітэт на чалавечы. Як тут не ўспомніць словы К. Каліноўскага: «Няма, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек у галаве мае розум і навуку...»

Беларуская нацыя сёння – грамадства ўсеагульнай пісьменнасці. Упэўнены, што наша мара «людзьмі звацца» будзе станоўча ўспрынята ў якасці Беларускай Нацыянальнай Ідэі свядомым беларускім грамадствам.

З павагай —
Валерый ГАРБАЦЭВІЧ, шахцёр.
г.Салігорск.

ГЛЫБІНКА

Дзіцячыя тэатры з малога гарадка

У загалоўку няма памылкі: так, менавіта два тэатры стварыў у Дзятлаўскім раённым доме культуры яго дырэктар **Іван Іванавіч Каско.** Дзякуючы яму мясцовая дзятва развівае свае здольнасці, мае магчымасць культурна і цікава бавіць час. Ён сам і мастацкі кіраўнік, і дырэктар тэатральнай студыі «Мелодыя душы», якая ўжо заваявала званне ўзорнага калектыву, а таксама Беларускага ігравога тэатра роставых лялек, між іншым, адзінага ў краіне, які называецца «Лялькі для ўсіх».

— Скажыце, калі ласка, колькі дзяцей займаецца пад вашым кіраўніцтвам?

— 30 — ва ўзорнай тэатральнай студыі «Мелодыя душы» і 15 — у Беларускім ігравым тэатры роставых лялек.

— А вашы дзеці наведваюць заняткі?

— А як жа! У мяне шасцёра дзяцей, і пяцёра з іх ходзяць на заняткі. Самы малодшы не выступае, бо ён яшчэ маленькі. Аднак летась і ён ужо прадэманстраваў свае здольнасці, калі наша сям'я брала ўдзел у раённым конкурсе шматдзетных сем'яў, дзе заняла першае месца. Думаю, з цягам часу будзе наведваць узорную тэатральную студыю «Мелодыя душы».

— Ведаю, што сёлета ва ўзорнай тэатральнай студыі юбілей — ёй спаўняецца пяць гадоў. Так бы мовіць, першыя маленькія артысты ўжо дарослыя. Ці стала для каго мастацтва справай жыцця?

— Так, Марына Цуманкова ўжо вучыцца ў Беларускай акадэміі мастацтваў на спецыяльнасці «рэжысура драмы», а Каця Губко і Насця Вакуліч, якія займаюцца ў тэатры-студыі «Мелодыя душы», яшчэ толькі мараць пра гэта. Мараць і настойліва працуюць.



— За пяць гадоў праз вашы рукі і сэрца прайшло шмат хлопчыкаў і дзяўчынак. Ці былі выпадкі, калі дзякуючы тэатру некаторыя адмовіліся ад дрэнных звычак?

— Былі, чаму ж не! Але я не хацеў бы пра гэта гаварыць, бо ўсё ўжо ў мінулым. Дзеці ведаюць, што ў нас вельмі строгія правілы: калі хочаш займацца, то і паводзіць сябе трэба належным чынам. Я вельмі рады, што замест бессэнсоўнага бадзяння па вуліцах дзеці далучаюцца да мастацтва, адкрываюць для сябе яго чароўны і непаўторны свет. Калі бачу іх радасныя твары, акрыленасць, я проста шчаслівы. Кожны месяц мы паказваем шоу-спектакль пад назвай «Я выбіраю жыццё». Ён прымушае задумацца аб многіх жыццёвых каштоўнасцях як саміх юных артыстаў, так і гледачоў. З ім мы наведваліся ў рэспубліканскі дзіцячы аздараўленчы цэнтр «Баравічок», а таксама ў райцэнтр Іўе. Неўзабаве паедзем у Гродна.

— Вашы творчыя калектывы, напэўна, пабывалі на гастролях у многіх мясцінах не толькі Гродзенскай вобласці, але і краіны, удзельнічалі ў фестывалях...

— Так, на фестывалі пад назвай «Казкі жыцця» мы занялі другое месца ў вобласці, а на абласным мерапрыемстве «Свіслацкі кірмаш» удастоены першага месца. Выступалі і ў Мінску на рэспубліканскім фестывалі тэатральных калектываў, які называўся «Дзверы». А так нашы пастаноўкі бачылі ў Лідзе, Стоўбцах, Гродне, Навагрудку, Ашмянах і шмат дзе яшчэ. Цяпер мы маем запрашэнне з Горак Магілёўскай вобласці, Барысава, Клімавіч, Свіслачы, зноў Ліды.

— Можа, у хуткім часе парадуеце сваіх паклоннікаў прэм'ерамі?

— Днямі Беларускі ігравы тэатр роставых лялек паказаў казку «Маша і Мядзведзь». Да таго ж у праграме і шоу мыльных пухіроў. Гэта сапраўды лялькі для ўсіх, паглядзець якія цікава як дзецям, так і дарослым.

У гэты ж дзень узорная тэатральная студыя «Мелодыя душы» парадавала гледачоў цікавым мюзіклам пад назвай «Станцыя мары».

Скажу больш: 1 мая ў нашым горадзе адбудзецца Першы адкрыты фестываль-карнавал роставых лялек і ігравых праграм, які будзе называцца «Дасканалы свет казкі». Галоўнымі героямі стануць персанажы з вядомых казак і любімыя дзятвой героі мультыкаў. Гасцей фестывалю чакаюць урачыстае шэсце роставых лялек, касцюміраванае шоу, спаборніцтвы, разлічаныя на ўсіх членаў сям'і, выступленне дзіцячых калектываў, творчая лабараторыя па вырабе роставых лялек і шмат чаго яшчэ. Да таго ж будуць праведзены творчыя майстар-класы для дзяцей і дарослых. Роставыя лялькі пройдуць па вуліцах горада. Іх будзе суправаджаць эстрадны духавы аркестр «Акцэнт» з пасёлка Наваельня.

Галоўны прыз фестывалю-карнавала — роставая лялька. У мерапрыемстве возьмуць удзел юныя артысты з Брэста, Баранавіч, Пружан, з розных гарадоў Мінскай і Гродзенскай абласцей.

— Дзякую, Іван Іванавіч, за гутарку і за тую добрую справу, якую вы робіце. Здароўя і поспехаў вам і вашым юным артыстам!

Гутарыла Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.
Дзятлаўскі раён.

АБВЕСТКА

ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны» запрашае на бясплатныя штотыднёвыя заняткі па беларускай мове, гісторыі, інфарматыцы для школьнікаў 7—9-х класаў у памяшканні Таварыства (Мінск, вул.Румянцава, 13, ст.метро «Плошча Перамогі»).

Заняткі праходзяць кожны панядзелак (з 16 да 18 гадзін) і кожны аўторак (з 17 да 19 гадзін).

ОБ ЭТОМ — ВПЕРВЫЕ

Миссионеры

Летом в африканскую страну едет первая группа миссионеров из Беларуси — помогать детям, которые живут на помойке и пьют из луж.

Потрясающая дикая природа со слонами, львами и розовыми фламинго; прародина человечества, на территории которой люди жили 3 миллиона лет назад; чай, кофе, сахарный тростник, фрукты, золото и рубины — всем этим знаменита Кения, одна из стран Восточной Африки.

Но это всего лишь часть, яркие картинки туристического проспекта. Приезжим не рекомендуют заходить вглубь городов, на окраинах которых можно оказаться в трущобе, и никогда не угощать местных детей конфетами — могут разорвать. Здесь большая детская смертность, высокий уровень криминала, СПИД, голод и очень много брошенных детей. Сироты живут на помойках и выпрашивают не еду — воду, если рядом нет луж. Волонтеры едут сюда со всего мира. Лекарства, еда, лишний билет на самолет для дополнительного багажа — рюкзака с конфетами, — всем этим живут граждане самых разных стран мира. Одни приезжают на несколько недель, другие остаются на полгода и дольше, открывают детские приюты, школы, строят храмы и колонки, откуда можно качать чистую воду.

*В прошлом году Кению впервые посетил миссионер из Беларуси, пастор протестантской церкви «Исток» гомельчанин **Олег Филатов**. Новая поездка запланирована на 1 июня, в Кению с миссионером отправится группа, костяк которой — прихожане церкви «Новая жизнь».*

Для чего наши соотечественники едут в Кению, сколько стоит поездка и опасно ли находиться в африканской стране, «Народная Воля» узнала у Олега Филатова, встретившись с миссионером в один из его приездов в столицу.













Сироты Кении или Беларуси?

— Олег, как вы узнали о сиротах Кении и почему решили отправиться в Африку помогать детям?

— Сообщил один из друзей в сети Facebook, пастор протестантской церкви Геннадий Махненко. Этот человек живет в Мариуполе, занимается детьми-сиротами: если не ошибаюсь, у него 33 приемных ребенка. Три года назад поехал в Кению, о чем и сообщил через Facebook. Я заинтересовался, возникла переписка — так я оказался в Кении.

— Усыновление детей — уважаемая миссия, но и в Беларуси хватает и сирот, и неблагополучных семей. Почему вдруг Кения? Это чужие дети, далекая страна, затраты…

— Чужих детей не бывает. Что касается Кении, речь идет не только о социальной помощи и поддержке, но и об одном из библейских принципов — проповедовать Евангелие до края земли. Помощь детям Кении — один из инструментов для проповедей Евангелия. Да, им надо помочь, подкормить, обогреть, как заповедовал Христос, но за всем этим стоит цель проповеди. Сейчас в Кении открываются приюты, детям вкладываются ценности в виде библейских принципов, чтобы из сирот выросли не люди с африканским мышлением, а люди с иным менталитетом. Такая работа — тяжелый, кропотливый труд. Сегодня в Африке много социальных проектов, на них уходит много денег, собираемых в других государствах, это бездонная бочка.

— Хотите сказать, что местное население паразитирует на деньгах, за которые куда проще купить наркотики, чем еду?

— Отчасти да. Но, прежде чем говорить о паразитировании, надо приехать в Кению и посмотреть на ее детей, тогда многие вопросы отпадут. По сравнению с этой страной, где много брошенных и голодных детей, у нас проблем вообще нет. Наше государство о несовершеннолетних заботится, в Кении до них никому и дела нет, или просто никто не хочет заниматься. Бывает, дети перегораживают дорогу, чтобы им дали напиться.

Наша миссия занимается установкой колонок. Когда их нет — люди пьют из болота — большой лужи с грязью. Поэтому установка колонки при приюте — обычно большой праздник. Вокруг начинает формироваться поселение, люди берут воду бесплатно.

Пыль и праздник в Киале

— Когда и в какой город Кении вы приехали впервые?

— В феврале 2013 года в город Киала с населением около 200 тысяч. В городе много базаров. В центре кирпичные здания, продуктовые магазины, можно купить дешевую одежду. На улице ничего не растет, только на охраняемой территории — за растениями надо ухаживать. Деревьев мало. Земля красного цвета. Первое время было тяжело — в городе стоит пелена пыли, от которой никуда не деться. А на улицах — атмосфера праздника, такое ощущение, что никто не работает. Люди тусуются с утра до вечера, ходят туда-сюда, днем на обочинах дорог, ближе к окраине, варят в общих котлах еду — в основном бобы.

Белые встречаются редко, это уважаемые люди. Как видно, к ним относятся почтительно еще и потому, что белые люди могут что-то дать.

— А чем жители Киала зарабатывают на жизнь?

— Сложно сказать. Есть сельское хозяйство — люди выращивают что-то, разводят скот. Видел, как делают кирпичи из глины — труд тяжелый, а платят за него немного. В городе развита торговля, есть швейные мастерские, заводов не видел.

Чемпионка из помойки

— Основные помощники для сирот — представители церкви?

— Да, конфессий много. Там нет ни разделения, ни неприязни, все живут без религиозных стычек, хотя в Кении неблагоприятная криминальная обстановка — даже двери движущегося автомобиля должны быть заблокированы, чтобы в пробке к тебе не вломились грабители.

— Первые миссионеры появились в Кении еще в середине XXI века, но сирот меньше не становится. Вам не кажется, что изменить менталитет граждан другой страны невозможно?

— Народ не спасу, а о конкретном человеке позаботиться могу. Как-то американский пастор Стив подобрал на помойке девочку, определил в приют, дал образование — сегодня она чемпионка по гольфу.

— Но и девочке-сироте из Беларуси тоже можно дать образование и помочь сделать карьеру…

— Помощь по своим возможностям мы оказывали и здесь, в интернате для детей с отклонениями. Но отношение к протестантской церкви в Беларуси не самое приветливое. Однажды я предложил гомельской больнице оказать духовную помощь наркозависимым, рассказать им, как избавиться от зависимости, поскольку знаю и умею это делать. Они отказались. Зачем навязываться, если с тобой не считаются?

Миссия за 2,3 тысячи долларов

— Сколько денег надо на поездку в Кению?

— По возможностям. Минимальная стоимость поездки, в которую включены расходы на проживание и пожертвования, — 2,3 тысячи долларов, цель — увидеть проблему. Зацепит — можно продолжать помогать. Знаю украинку, которая оставила бизнес на знакомых и задержалась в Кении на полгода. Парень из Америки купил участок земли на деньги прихожан, строит приют для сирот.

— Кто едет вместе с вами?

— Верующие люди, большинство — из церкви «Новая жизнь», люди со средним достатком.

— …которым сложно накопить 2,3 тысячи долларов?

— Когда появляется мотивация, ты изыскиваешь возможности и скапливаешь деньги.

— Почему бы просто не рассказать о проблеме прихожанам, среди которых наверняка есть люди с высоким достатком?

— Я устраиваю презентации, рассказывая о детях Кении, прихожане интересуются, некоторые дают деньги. Но обычно жертвуют на конкретный проект, а не на абстрактные вещи. В прошлом году две украинские девушки получили 20 тысяч долларов, чтобы выкупить участок земли под приют. Когда у нас появятся планы по покупке земли, наверняка найдутся люди, которые пожертвуют.

— А как насчет идеи сделать презентацию не в церкви, а, скажем, в крупной компании?

— Если порекомендуют — почему нет? О поездке в Кению думают два гомельских бизнесмена, работающих в Москве. Но пока многие относятся к протестантской церкви с опаской, думая, что там их могут обмануть.

Страна без проблем

— Поехать в Кению, увидев настоящую жизнь без прикрас наверняка пожелают многие — это же экстремальный туризм!

— Думаю, это могло быть одним из направлений поездки — из интереса. Уверен, как только адекватный человек увидит происходящее, он начнет жертвовать. Сильно на таких людей не рассчитываю, но если они появятся — я только за. Надеяться на богатых людей — полнейшая утопия, они жертвуют реже, чем небогатые. Рассчитываем на свои силы и на Бога. Если это божий проект, все нужды будут восполнены.

— Девиз Кении — Hakuna Matata, жизнь без проблем. Кто в Кении живет без проблем?

— Суть африканского менталитета в том и состоит, что у наблюдателей складывается впечатление: при большом количестве проблем эти люди живут без проблем. Среди нищих и больных СПИДом царит атмосфера радости и веселья. Разница с Беларусью — колоссальная. Увидев Кению, я вдруг понял, что у меня нет проблем, поездка в эту страну — отличная терапия для страдающих депрессией. Она не дешевая, но эффективная, переосмысление жизни в Кении огромное.

— Постоянное лето, экзотические фрукты, атмосфера радости и веселья — что может шокировать приезжего?

— Детская боль, условия жизни, еда, источники воды в виде луж, полное безразличие государства по отношению к сиротам. Все школы — частные и платные, большинство детей не учится. Дети грязные, сопливые, плохо пахнут, а когда подходишь к ним, лезут на руки. В детском доме, на помойке, где они спят вместе со свиньями, никто не берет их на руки. Я не мог удержаться от слез, осознав, что дети в Кении никому не нужны.

— Съездите в Кению еще раз — и привыкнете…

— Да, эмоции улягутся, но христианская жизнь основана на выборе, а не на эмоциях. Приняв вызов от Бога, мы должны помогать этим людям. Перед нами открыт весь мир, и Кения — один из этапов. Мы хотим иметь в этой стране кусок земли, приют, возможно, миссионерскую школу, где будем учить подобранных на помойке детей, вкладывать в них любовь и заботу, чтобы они вырастали людьми, готовыми взять ответственность за себя и своего ближнего. Сегодня в Кении отвечать за себя не могут даже взрослые, они не приспособлены для самостоятельной жизни!

— Сложную работу вы на себя взяли — менять людей, которые не хотят меняться…

— Все начинается с одного человека, который, меняясь, начинает влиять на других. Не надо брать огромные масштабы, послужи одному.

Прививка от Африки

— По рассказу бывалых, в Африке много опасностей. Ты вешаешь, к примеру, белье, мухи откладывают на нем личинки, те проникают в тело человека и вызывают смерть. Сложно ли подготовиться к поездке в Кению?

— Нет. Мы делаем прививку против желтой лихорадки, пьем воду только из бутылок, покупаем продукты только в определенных магазинах. С такими мерами предосторожности проблем не возникает.

— Где живете?

— Семейные — в спортивном клубе для богатых, одинокие — у пастора в доме, который переселился в палатку. На проживание, еду, охрану, пожертвования уходит около 100 долларов в день.

— 1 июня вы возвращаетесь в Кению. Как думаете, вспомнит ли вас местное население?

— Дети — нет, мы для них все на одно лицо.

Конфета или жизнь

— На одном из туристических сайтов нашлась рекомендация: ничего не давать жителям «дикой» страны. Конфета туриста — уже сама по себе стресс для голодного ребенка, но, получив ее несколько раз, он испытывает стресс уже от того, что не получает конфету каждый день…

— Мы раздаем конфеты централизованно, дети выстраиваются в очередь и скромно ждут, что им что-то дадут, не считая это за должное.

— Однако, делясь с журналистами воспоминаниями о предыдущей поездке, вы сказали об определенной опасности раздачи конфет на улице — тебя могут разорвать…

— Если поставить конфеты перед детьми, они будут лезть. Но когда я закрываю их и говорю, что конфеты закончились, они останавливаются. Да, когда детей много, срабатывает эффект толпы — далеко не все воспитанные, порядочные и честные. Но и малолетними преступниками их не назовешь. Боль, которая у них в глазах, — больше, чем испорченность.

Беспризорников забирают с улицы, за 600 долларов в год помещают в приют. Одежда, еда, вода — за все это в приюте надо платить. Половина убегает — тяжело перестроиться. С уличными детьми, к слову, надо держать ухо востро — они могут украсть. В трущобах, по совету пастора, все фотоаппараты оставляли в машинах, брали только один, а фотографа обступали те, кто покрепче, выполняя функцию охранников.

— Как выглядят трущобы?

— Хижины из ветвей, сплетенных друг с другом. Особый шик — штукатурка коровьими лепешками. Накрывают чем найдут — жестью или фанерой, кровать — тряпки и целлофан. Все, что можно найти на мусорке, несут в жилье.

— Пытаются ли люди улучшить свои условия жизни?

— По ощущениям — только отдельные личности. В прошлом году американцы примерно за тысячу долларов купили мотоцикл и дали в аренду для работы в такси, или пики-пики, как его называют. Год таксист отрабатывает стоимость мотоцикла и передает следующему. Но таких немного…

Елена АНКУДО.

ЧУЛІ?

Атрымаць польскі шэнген стане прасцей

З 1 красавіка 2014 года консульскія аддзелы пасольства Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь пачнуць выдачу шэнгенскіх віз з улікам некаторых змен. Аб гэтым interfax.by стала вядома з аб'явы на інфастэндзе консульства ў Мінску.

Для шматразовых віз «на закупы» з неабходнага пакета дакументаў цяпер выключаны раней абавязковыя запрашэнні з польскага боку.

Таксама цяпер пры наяўнасці не менш як дзвюх шэнгенскіх віз на працягу трох апошніх гадоў (адной з іх польскай) можна будзе атрымаць гадавы турыстычны шэнген.

Школьнікі пачатковых і сярэдніх класаў, а таксама настаўнікі, якія бяруць удзел у адукацыйных паездках, змогуць разлічваць на атрыманне шматгадовых віз. Змененыя правілы ўступаюць у сілу з 1 красавіка 2014 года.

ТЫМ ЧАСАМ

У Турцыю — па новых правілах

МЗС Беларусі па дыпламатычных каналах атрымала інфармацыю аб тым, што з 11 красавіка гэтага года ў Турэцкай Рэспубліцы ўводзяцца новыя правілы ўезду ў краіну.

З гэтага часу візы для турыстычных або дзелавых паездак будуць выдавацца праз новую электронную сістэму. Да канца турыстычнага сезона застанецца і традыцыйная віза — штамп у аэрапорце, але каштаваць яна цяпер будзе даражэй.

— Сістэма заменіць існуючую працэдуру атрымання адлаведнага дазвольнага штампа непасрэдна ў аэрапорце прыбыцця. Для афармлення электроннай візы іншаземец, які накіроўваецца ў Турцыю, павінен будзе запоўніць форму на сайце www.evisa.gov.tr, аплаціць паслугу з дапамогай крэдытнай або дэбетавай карты, атрымаць пацвярджальны дакумент на свой электронны адрас і затым раздрукаваць яго, — растлумачылі ў МЗС Беларусі.

Паводле паведамленняў турэцкага боку, для прадухілення цяжкасцяў падчас турыстычнага сезона 2014 года на працягу пераходнага перыяду памежныя ўлады Турцыі будуць таксама выдаваць візы ў існуючым цяпер рэжыме, аднак яе кошт вырастае з 20 да 30 долараў.

Інфармацыю аб памеры візавых збораў можна знайсці на веб-сайце МЗС Турцыі.

КАШАЛЁК

Бацькі будуць аплачваць поўны кошт харчавання дзяцей у садках

Ва ўрадзе кажуць, што атрыманыя сродкі пойдуць на павышэнне заробкаў выхавальнікаў.

«У цяперашні час выдаткі бюджэту на ўтрыманне аднаго дзіцяці ва ўстанове дашкольнай адукацыі складаюць у сярэднім 1,5 мільёна рублёў у месяц, бацькі аплачваюць усяго каля 20% выдаткаў, — каментуюць адпаведную пастанову Савета міністраў ва ўрадзе. — Пасля прыняцця пастановы бацькі будуць аплачваць у поўным аб'ёме толькі кошт набору прадуктаў харчавання, гэта значыць плата бацькоў павялічыцца ў сярэднім на 150 тысяч».

Пры гэтым шматдзетныя сем'і па-ранейшаму будуць плаціць за харчаванне ў дзіцячых садках толькі палову яго кошту. Бацькі дзяцей-інвалідаў, дзяцей, якія пакутуюць на анкалагічныя захворванні, хворых на туберкулёз, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека, а таксама члены сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі пры выкананні вайсковага або службовага абавязку, як і раней, будуць вызвалены ад дадзеных выдаткаў.

«Уведзены і новыя льготы па аплаце харчавання для асобных катэгорый грамадзян. Так, на 30% знізіцца плата для сем'яў, у якіх двое дзяцей наведваюць дашкольную ўстанову, на 50% — для апекуноў, прыёмных бацькоў, бацькоў-выхавальнікаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, дзіцячых вёсак (гарадкоў)», — цытуе finance.tut.by прэс-службу Савета міністраў.

МАРШРУТЫ

Пешшу альбо ўсё-такі цягніком?

У Беларусі з 1 красавіка павышаны тарыфы на перавозкі пасажыраў і багажу чыгуначным транспартам.

Тарыф на праезд на рэгіянальных лініях эканом-класа падаражэе на 33,3% да 1200 рублёў за адну зону праезду і да 120 рублёў за 1 км праезду.

Кошт паездкі на цягніках гарадскіх ліній павышаны на 32% да 6600 рублёў пры перавозы пасажыраў у межах аднаго тарыфнага пояса, на 30% да 7800 рублёў пры перавозцы пасажыраў у межах двух тарыфных паясоў, на 30,9% да 11.400 рублёў у межах трох і на 30% да 15.600 рублёў у межах чатырох тарыфных паясоў.

На 33% узнімаецца кошт праезду пасажыраў цягнікамі на рэгіянальных лініях бізнес-класа.

Апроч таго, на 25—33% павялічаны тарыфы на перавозку багажу на гарадскіх, рэгіянальных і міжрэгіянальных лініях.

ЗА РУЛЁМ

У цэнтры Мінска згарэла аўто

Учора ў самую гадзіну пік на скрыжаванні вуліц Першамайскай і Я.Купалы выехалі супрацоўнікі экстранных службаў. Там адбылося ўзгаранне аўтамабіля Volkswagen Polo. Як высветлілася, гэтаму папярэднічала сутыкненне з Renault Megane. У ДАІ ўдакладнілі: пацярпела дзяўчына, якая ехала за рулём гэтай машыны.

— Паведамленне аб узгаранні паступіла ў 08.54, ліквідавана ўзгаранне ў 09.03, — паведаміў памочнік начальніка гарадскога ўпраўлення МНС **Віталь Дэмбоўскі**. — Volkswagen Polo 1996 года выпуску выгараў цалкам.

Карэспандэнту Onliner.by ўдалося пагутарыць на месцы здарэння з кіроўцам Volkswagen. Мужчына знаходзіўся ў шокавым стане. Ён выкладчык адной з ВНУ. Распавёў, што рухаўся з боку парку імя Горкага да стадыёна «Дынама».

— Дзяўчына на сустрэчным Renault спрабавала праскочыць, дакладней сказаць, павярнуць налева, — выклаў сваю версію ўладальнік хэтчбэка. — Але не паспела. Мне не было куды сыходзіць: злева шмат машын, а справа — пешаходы.

В ДАІ Партызанскага раёна дадалі, што пацярпела вадзіцель Renault, 1987 года нараджэння. З папярэднім дыягназам «удар грудной клеткі» яе даставілі ў шпіталь.

— Сапраўды, яна здзейсніла паварот налева, і адбылося сутыкненне з Volkswagen, — распавяла старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ раёна **Тацццяна Талеронак**. — Па факце ДТЗ праводзіцца праверка.



ХТО КАГО?

NATO і Расія: параўнанне сіл

Еўрапейскія члены NATO агулам у тры разы перавышаюць Расію па колькасці салдат і расходаў на ўзбраенне, але гэта малюе несапраўдную карціну сіл.

Бо, калі казаць пра велічыню арміі, то ў гэтым пытанні галоўны ўнёсак Турцыі, якая мае толькі крыху меншую армію, чым Расія: Турцыя — 660 тыс. салдат, Расія — 760 тысяч. Толькі дзве еўрапейскія краіны NATO — Вялікабрытанія і Францыя — прызначаюць на абарону палову таго, што прызначае Расія. Цікава таксама адзначыць, што толькі шэсць краін з 26 у Еўропе выконваюць рэкамендацыі NATO і выдзяляюць на армію 2% ВУП краіны. Расія выдзяляе 4,4% ВУП.

СЛЫШАЛИ?

Крымские татары хотят создать автономию в Крыму

Прошедший в Бахчисарае курултай крымскотатарского народа постановил начать создание в Крыму национально-территориальной автономии, говорится в постановлении, принятом на внеочередной сессии курултая — органа народного представительства. Председатель меджлиса крымских татар **Рефат Чубаров** заявил журналистам, что этот документ не признает аннексию Крыма и потерю Украиной территории полуострова.

Чубаров также предположил, что крымские татары могут провести национальный референдум, чтобы подтвердить свое стремление к автономии. *«Курултай крымскотатарского народа постановил провозгласить о начале политических и правовых процедур по созданию национально-территориальной автономии крымскотатарского народа на его исторической территории — в Крыму»,* — говорится в документе.

Курултай также получил меджлису наладить отношения с международными организациями (ООН, ОБСЕ и другими) и правительствами стран. Курултай призвал эти организации и правительства поддержать право крымскотатарского народа на самоопределение.

КОРОТКО

Сенсационные выборы во Франции: социалисты проиграли, а мэр Парижа «надел юбку»

Правящая Социалистическая партия потерпела серьезное поражение во втором туре муниципальных выборов во Франции, хотя социалистка Анн Идальго все же сумела выиграть на выборах мэра Парижа.

Многочисленные недовольные политикой президента Франсуа Олланда проголосовали за правых и ультраправых. Лидер правоцентристского «Союза за народное движение» **Жан-Франсуа Копе** назвал случившееся «голубой волной» поддержки партии. При этом и многие левые избиратели голосовать не пошли, снизив показатели явки и дополнительно повредив социалистам.

Национальный фронт во главе с **Марин Ле Пен** одержал победу по крайней мере в 10 муниципалитетах. Такого успеха радикалы не знали за всю историю существования своей партии, созданной в 1972 году.

В Париже социалистам удалось сохранить пост мэра, который на протяжении последних 13 лет занимал **Бертран Деланоэ.** Его сменит его заместительница Анн Идальго, которая станет первой женщиной-мэром в истории французской столицы.

Успех партии Эрдогана

Правящая Партия справедливости и развития добилась заметного успеха на прошедших в воскресенье муниципальных выборах в Турции. На втором месте — кемалистская Народно-республиканская партия, на третьем — Партия националистического движения.

Лидер Партии справедливости и развития Эрдоган активно агитировал за кандидатов от партии, и голосование рассматривалось как референдум о доверии к политику, находящемуся на вершине турецкого властного олимпа уже 10 лет. Это первые выборы в стране после начала массовых протестов в мае и коррупционного скандала в декабре прошлого года. Явка избирателей была высокой.

Муниципальные выборы стали экзаменом перед президентскими, которые должны состояться в августе, и выборами в парламент, назначенными на будущий год. По сообщениям, на юге и востоке страны в результате двух столкновений между сторонниками соперничающих партий погибло восемь человек.

Египет: президентские выборы состоятся 26 и 27 мая

В воскресенье Высшая избирательная комиссия заявила, что президентские выборы в Египте пройдут 26—27 мая. Если победитель не определится в первом туре, второй пройдет 16—17 июня.

Регистрация кандидатов на пост главы государства началась в понедельник, 31 марта, и продлится до 20 апреля.

СТОП-КАДР

Маніла, сталіца Філіпін. Удзельнікі дэманстрацыі каля пасольства ЗША. Яны супраць дамовы, якая ўзаконьвае прысутнасць амерыканскіх войскаў у краіне. Жанчына крычыць на паліцэйскіх, якія дубінкай паранілі мужчыну.



ЧТО ТАМ, В УКРАИНЕ?

Желание побороться за пост главы государства изъявили около 40 претендентов

Официально статус кандидата в президенты уже получили несколько человек — бывшие вице-премьеры Юрий Бойко и Сергей Тигипко, экс-губернатор Харьковской области Михаил Добкин, бывший замгенпрокурора Ренат Кузьмин, бизнесмен Вадим Рабинович, экс-депутат Верховной Рады Валерий Коновалюк и руководитель компании «Интерагроэкспорт» Владимир Саранов.

Четыре парламентские фракции — «Батькивщина», «УДАР», «Свобода» и Партия регионов провели съезды, на которых были выдвинуты кандидаты в президенты. Как и ожидалось, «Батькивщина» назвала претендентом на высший государственный пост лидера партии **Юлию Тимошенко**, «Свобода» — своего лидера **Олега Тягнибока.** Лидер фракции «УДАР» **Виталий Кличко,** ранее заявивший о своих президентских амбициях, отказался от прежних планов, решив поддержать депутата парламента, олигарха **Петра Порошенко**, который вступит в президентскую гонку как самовыдвиженец. За пост президента будут бороться **Анатолий Гриценко**, **Наталья Королевская** и лидер «Правого сектора» **Дмитрий Ярош**.

Желание побороться за пост главы государства изъявили около 40 претендентов, нескольким из них было отказано из-за неверно оформленных документов. Полный пакет документов и необходимый денежный залог внесли 24 человека. Окончательный список кандидатов в президенты будет известен 4 апреля.

У СОСЕДЕЙ

На выборах президента Литвы поборются восемь кандидатов


*Еще четыре претендента вынуждены были прекратить свое участие. Они не смогли собрать необходимые 20 тысяч подписей избирателей в свою поддержку. Среди оставшихся кандидатов лидером по подписям стала действующий президент **Даля Грибаускайте**, претендующая на второй срок. Она представила в Главизбирком 67,6 тысячы подписей. Главный по этому показателю конкурент Грибаускайте почти не уступает действующему президенту: кандидат от социал-демократов европарламентарий **Зигмантас Бальчитис** собрал 66,8 тысячи голосов.*

По данным "Парламентской газеты", действующий президент Литвы может победить на новых выборах уже в первом туре. По итогам социологического опроса, проведенного в Литве фирмой Vilmorus, лидером кампании по выборам президента остается глава государства Даля Грибаускайте. За нее готовы отдать голоса около 41% избирателей.

Выборы главы Литвы состоятся 11 мая. Президент в Литве избирается прямым тайным голосованием на пять лет. Главой Литвы может быть избран литовский гражданин по рождению, проживавший в Литве по крайней мере последние три года. Кроме того, для кандидатов на этот пост существует возрастной ценз — 40 лет. Никто не может избираться на пост президента более чем на два срока подряд.

НОВЫЕ ИМЕНА

На президентских выборах в Словакии победил бизнесмен Андрей Киска



Во втором круге он обошел нынешнего премьер-министра Словакии Роберта Фицо и набрал почти 60% голосов.

После объявления предварительных результатов он дал в своем избирательном штабе пресс-конференцию, в ходе которой поблагодарил всех проголосовавших за него. *«Я обещал, что буду президентом всех словаков, я выполню это обещание. Я буду улучшать нашу политику, я сделаю все, чтобы политика стала человечной»,* — заявил Киска, обращаясь к своим праздновавшим победу сторонникам.

Успеху Андрея Киски способствовал его образ новичка в политике, не замешанного ни в каких коррупционных скандалах. В ходе предвыборной кампании он обещал бороться с коррупцией и создать более эффективное правительство.

Киска должен вступить в должность президента Словакии 15 июня. Он сменит на этом посту политика левого толка **Ивана Гашпаровича.**

ТАМ, ЗА БУГАМ

Апека нямецкіх пенсіянераў

Дом пенсіянера ў Забэлкаве на паўднёвым захадзе Польшчы выглядае як звычайны дом адпачынку для пажылых людзей. Цагляны будынак у некалькі паверхаў, інвалідная рампа, цішыня, спакой, вакол парк, апісвае штотыднёвік «Wprost». Толькі ўнутры бачым, што нешта тут не так. Кухоннае абсталяванне нямецкай маркі Bosch. Па тэлевізары ідуць нямецкія праграмы. Тое самае з голасам у ліфце.

Дом пенсіянера ў Забэлкаве два гады таму пабудаваў немец Фабрыс Гердэс са сваім польскім цесцем. «На дадзены момант усе месцы заняты. У большасці гэта нямецкія пенсіянеры. Зараз у нас жыве 14 немцаў. Яны займаюць двухмесныя і аднамесныя нумары. Кожны дзень іх наведвае ўрач, персанал гаворыць па-нямецку, мы рыхтуем для іх нямецкае меню», — кажа Эва Пятроўска, дырэктар Судэцкага дома пенсіянера «Сонечная паляна» ў г.Шклярска Парэмба.

Паводле ацэнак ААН, да 2050 года ў структуры насельніцтва свету ўтрая павялічыцца група людзей, старэйшых за 60 гадоў, а немцы «старэюць» хутчэй за ўсіх. На працягу бліжэйшых 30 гадоў іх грамадства стане адным з найстарэйшых у свеце.

Палякі хочуць зрабіць усё, каб заходнія суседзі старэлі менавіта тут, у Польшчы. Гэта прыносіць немалыя даходы. Зрэшты, немцы самі пачалі шукаць месцы для сваіх пажылых суайчыннікаў за мяжой з-за высокага кошту ўтрымання сваіх такіх устаноў. Месячны кошт пражывання ў нямецкім доме састарэлых складае ў сярэднім 3500 еўра. У Польшчы тыя ж паслугі каштуюць ад 3,5 тысячы да 7 тысяч злотых. Гэта ў 2—3 разы меней, піша штотыднёвік «Wprost».

Улады Апольскага рэгіёна (ля мяжы з Нямеччынай) кажуць, што ў іх вельмі пажаданыя не толькі дамы пенсіянераў, але нават цэлыя паселішчы для пажылых людзей. Гэта можа быць амаль што вёсачка для пенсіянераў з касцёлам, клінікай, рэабілітацыйна-санаторным цэнтрам.

ФОТААКНО



Бежанцы з Паўднёвага Судана

З-за ўзброенага канфлікту ў гэтай краіне ўжо загінула 10 тысяч чалавек. Каля мільёна вымушаны пакінуць свае дамы. Многія з іх знайшлі прытулак ва Угандзе. У лагерах яны пакутуюць ад хвароб і голаду. На здымках: бежанцы ідуць за вадой, і прадстаўнік ЮНІСЕФ регіструе маці з дзецьмі ў перапоўненай палатцы.



ДУЭЛЬ

Не договорились?

Государственный секретарь США Джон Керри провел в Париже экстренную встречу с главой российского МИД Сергеем Лавровым, в ходе которой обсуждалась критическая ситуация, сложившаяся вокруг Украины. На пресс-конференции по итогам встречи Керри подчеркнул, что Россия и США признают важность поиска политического разрешения кризиса в Украине. При этом, по его словам, Соединенные Штаты по-прежнему расценивают аннексию Крыма Россией как «незаконную и нелегитимную».

Джон Керри еще раз отметил, что США хотят, чтобы Россия отвела свои войска от границы с Украиной. Он подчеркнул, что никаких решений относительно будущего Украины не будет приниматься без участия властей Украины. *«Украинцы сами выберут свое будущее. Мы не обсуждали это, поскольку это было бы нечестно в отсутствие представителя Украины»,* — заявил госсекретарь США.

В свою очередь Сергей Лавров на отдельном брифинге рассказал о том, что Москва и Вашингтон намерены сотрудничать с правительством в Киеве в вопросах соблюдения прав русскоязычных жителей Украины и *«разоружения нерегулярных сил и провокаторов».*

Еще накануне встречи со своим американским коллегой в интервью телеканалу «Россия 1» Лавров заявил, что у России нет намерения посылать войска на территорию Украины. Однако договоренности об отводе российских войск от границ Украины на переговорах достигнуто не было, что дало повод некоторым СМИ — например, The New York Times — назвать их *«безрезультатными».*

При этом Лавров добавил, что Россия готова защищать права русского и русскоязычного населения Украины любыми способами, в том числе дипломатическими, политическими и юридическими.

В этой связи Лавров потребовал принятия новой Конституции Украины, провозглашающей ее федеративным и нейтральным государством. Правительство в Киеве в ответ заявило, что принятие российского требования равнозначно «полной капитуляции».

ПРОГНОЗ


ООН: изменение климата угрожает человечеству

Происходящее на Земле изменение климата представляет серьезную угрозу для здоровья людей, экономического развития, а также снабжения водой и продовольствием. Об этом говорится в докладе Межправительственной группы экспертов по изменению климата (IPCC), распространенном ООН в Йокогаме в понедельник, 31 марта.

Как сообщает агентство Reuters, в документе обращается внимание на риски, связанные с потеплением климата. Во многих регионах гибнет урожай, участились случаи наводнений, обостряются экономические кризисы, происходит обнищание людей.



ВІНШУЕМ!



Кастусю Цвірку — 80!

Так сталася, што да чытання я прывучыў сябе з дзяцінства. Натуральна, што малым хлопцам і падлеткам я не быў унікумам і захапляўся той літаратурай, у якой паўставалі вобразы новых, звычайна вельмі далёкіх краін, астравоў і кантынентаў. Мяне, як і шмат каго з людзей нашага пакалення, вабілі далёкія краіны, прымушалі моцна перажываць за сябе героі твораў **Даніэля Дэфо, Фенімора Купера, Аляксандра Дзюма, Вальтэра Скота, Томаса Майна Рыда, Янкі Маўра**, а настольнай і не адзін раз уздоўж і поперак перачытанай кнігай былі «Дзеці капітана Гранта» **Жуля Верна**. Мацярык праўдзівай беларускай гісторыі і выбітных беларусаў адкрываўся мне — і, відавочна, не аднаму мне — куды пазней, калі вядомымі і даступнымі зрабіліся кнігі **Уладзіміра Караткевіча, Кастуся Тарасава, Леаніда Дайнекі, Алега Лойкі, Генадзя Кісялёва…** Але ў душы ўвесь час заставалася адчуванне, што на створаным у гэтых кнігах беларускім кантыненце ўсё ж такі нечага не хапае. Не хацелася, прыкладам, верыць, што паэзія нашай зямлі ў XIX стагоддзі — калі ў нашых геаграфічна найбліжэйшых суседзяў ужо былі **Аляксандр Пушкін, Міхаіл Лермантаў, Тарас Шаўчэнка, Юльюш Славацкі ці Цыпрыян Норвід** — амаль выключна абмяжоўвалася нясмелымі дыдактычнымі або палітычна заангажаванымі беларускамоўнымі паэтычнымі спробамі **Яна Чачота, Уладзіслава Сыракомлі, Вінцэся Каратынскага ці Фелікса Тапчэўскага**. І толькі ў канцы 1980-х гадоў перад нашымі вачыма, нібы са дна мора, стаў усплываць магутны востраў — паэзія нашых землякоў, створаная на польскай мове — мове, якой, з прычыны гістарычных абставін, у той час карысталася практычна ўся наша эліта, у асноўным сканцэнтраваная ў беларускіх шляхецкіх фальварках. Адным з галоўных першаадкрывальнікаў гэтага вострава стаў чалавек, які ў гэтыя дні спраўляе сваё васьмідзесяцігоддзе, — Кастусь Аляксеевіч Цвірка.

Кастусь Цвірка належыць да таго самага «філалагічнага пакалення» беларускіх літаратараў, якое, прабіўшыся на паверхню ў часы хрушчоўскай русіфікацыі, здолела не толькі ўратаваць беларускую мову, вывесці яе з-пад сялянскай страхі на шырэйшы абшар, але і паказаць новыя далягляды яе развіцця. Цвіркавымі аднакашнікамі, калегамі па вучобе ў Белдзяржуніверсітэце ў тыя гады былі **Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Міхась Стральцоў, Вячаслаў Адамчык, Янка Сіпакоў, Віктар Карамазаў**, згаданы ўжо вышэй **Алег Лойка…** Абсалютна не перабольшу, калі скажу, што гэтыя людзі — вядома ж, разам з Танкам, Куляшовым, Панчанкам, Брылём, Быкавым, Караткевічам — ўратавалі нашу мову ад татальнай згубы і, як маглі, стварылі ўмовы, каб наступныя пакаленні падставілі ёй свае плечы.

Кастусь Цвірка паходзіць з самага сэрца беларускай зямлі, з легендарнай Старадарожчыны, але яго ўласнае сэрца належыць усёй Беларусі — і гістарычнай, і «негістарычнай». З маладых гадоў ён апантаны гісторыяй і фальклорам роднага краю; у 1972 г. атрымлівае навуковую ступень кандыдата гістарычных навук. Да гэтага часу ўжо ён вядомы не толькі і не столькі як аўтар фальклярыстычных навуковых прац, а і як адметны паэт, аўтар некалькіх кніжак, у тым ліку дзіцячых. Сапраўдныя ж захапленні гістарычным краязнаўствам і гісторыяй польскамоўнай беларускай паэзіі пачынаюць рабіцца вядомымі шырокаму колу чытачоў з сярэдзіны васьмідзясятых гадоў. Памятаю, як я некалькі разоў перачытваў кнігу Цвіркавых гістарычна-краязнаўчых нарысаў «Той курган векавечны…» і адразу пасля яе выхаду ў 1985 годзе, і пазней.

Кастусь Цвірка намагаецца вярнуць Беларусі ладную частку спадчыны яе выдатных сыноў, што ў далёкія гады (1817—1823) стварылі ў Віленскім універсітэце першыя на зямлі былога Вялікага Княства Літоўскага таварыствы еўрапейскіх інтэлектуалаў і гарачых аматараў культуры і гісторыі сваёй зямлі — філаматаў і філарэтаў. Падрыхтаваная і забяспечаная грунтоўным уступным артыкулам анталогія «Зорка філаматаў», аднак, не на адзін год «залягла» ў дзяржаўным выдавецтве «Мастацкая літаратура». Цвірка, аднак, не склаў рук і вырашыў узяць справу, што называецца, у свае рукі. У кантакце з калегамі з акадэмічнага Інстытута літаратуры ён у сярэдзіне дзевяностых гадоў распрацоўвае праект «Беларускага кнігазбору» — двухсоттомнага выдання беларускай і сусветнай класікі, і сам, тады без адзінага рубля дзяржаўнай падтрымкі, бярэцца за ажыццяўленне гэтага праекта. Адным з першых тамоў, што тады ўбачылі свет, была, натуральна, вышэйзгаданая анталогія творчасці філаматаў і філарэтаў, а на сённяшні дзень у серыі ўжо выйшла сем дзясяткаў прыгожа аформленых і забяспечаных навуковым апаратам тамоў! І гэта пры тым, што серыя па-ранейшаму выдаецца ў недзяржаўным выдавецтве, а выдавецкім працэсам і маркетынгам займаецца ў асноўным толькі маладзейшы аднадумец і паплечнік Цвіркі **Генадзь Вінярскі**. Чын Кастуся Цвіркі сёння не без падстаў параўноўваюць з чынам самога Францішка Скарыны.

Увесь гэты час Кастусь Цвірка не кінуў займацца і ўласнай творчасцю — чаго вартыя хоць бы яго «Гісторыя Беларусі ў легендах і паданнях» або аповесць «Воўчая выспа»! Яго пераклады беларускіх паэтаў з польскай мовы публікуюцца асобнымі кніжкамі (як славутыя «Дзяды» Адама Міцкевіча), а таксама ў самых розных зборніках і анталогіях. Творчых жа планаў у спадара Кастуся, наколькі я ведаю, па-ранейшаму не перабраць. Пажадаем яму іх поўнага здзяйснення!

Лявон БАРШЧЭЎСКІ.

ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ

Павел і Ганна Харланчук-Южаковы і іх чацвёра дзяцей

Не кожны дзень у артыстаў выдаецца вольная хвілінка. Давялося шмат чакаць, каб распытаць акцёраў тэатра і кіно, а таксама бацькоў чацвярых дзяцей Паўла і Ганну Харланчук-Южаковых пра іх сямейнае жыццё.







Павел: — Вялікая сям'я — гэта калі ты жывеш з адчуваннем, што ў цябе некалькі рук, ног і галоў. Напрыклад, у гэтыя дні я паўтараю тэкст новага спектакля, на паўсядзённыя клопаты часу не хапае, нават прычасацца магу забыцца. Але тут як тут дзеці — хатнія стылісты, якія зоймуцца маім выглядам, пакуль я буду адпачываць пасля напружанай працы. Гэта ж неацэнная эканомія часу!

На жаль, для сям'і ў нас, артыстаў, ёсць толькі адзін выхадны дзень. Падчас гастроляў і яго няма. Таму вольны дзень — вельмі важны для кожнага з нас. Мы шмат размаўляем, гуляем, вырашаем надзённыя пытанні, дзівімся адно аднаму, радуемся кожнай хвіліне. Гэта сапраўдная канцэнтрацыя сямейнага шчасця.

Здароўе вялікай сям'і — немалаважнае пытанне. Асабліва складанымі бываюць сітуацыі, калі пачынаецца ланцуговая рэакцыя: адзін ачуняў — другі захварэў ці ўсе захварэлі адначасова. На дапамогу прыходзіць наша мама — самы чулы доктар на свеце. Яна ведае і ўмее ўсё: і дыетолаг, і фізіятэрапеўт, і педыятр…

Ганна: — Вядома, часам бывае няпроста. Але перыядычна здараецца нешта такое смешнае, кранальнае, захапляльнае, што любыя цяжкасці перакрываюцца з лішкам. Гэтыя моманты неверагодна каштоўныя і даюць вельмі магутны энергетычны зарад.

Павел: — Чым большая сям'я, тым прасцей і хутчэй разбураюцца стэрэатыпы. Напрыклад, прыпісванне адных якасцяў і характарыстык дзяўчынкам, а іншых — хлопчыкам церпіць поўны крах. Наш старэйшы сын Філіп, можна сказаць, знаходзіцца ў канфрантацыі з тыповым наборам хлапечых рыс. Гарэза, шкоднік і хуліган — гэта не пра яго. Філіп вельмі спакойны чалавек. І наадварот, дачка Адэля — сапраўдны віхор і разбойніца. Для нас, бацькоў, важна, што кожнае дзіця мае свае ўнікальныя рысы.

Ганна: — Так, стэрэатыпы перашкаджаюць зразумець сутнасць чалавека. Варта быць уважлівым адзін да аднаго, прыслухоўвацца да таго, што хоча сказаць дачка, сын ці муж, падзяліцца патаемным або проста смешным, і сям'я на вачах робіцца мацнейшай.

Павел: — У маім дзяцінстве было шмат такога, ад чаго хацелася б засцерагчы дзяцей. Гаворка не пра нешта выключнае, а якраз наадварот — пра тыповае для вялікай колькасці сем'яў. Адасобленасць, нават некаторая абыякавасць аднаго члена сям'і да другога, няздольнасць адэкватна выказваць любоў і пяшчоту сустракаюцца досыць часта. Таму я хачу, каб маім дзецям было дастаткова мацярынскай і бацькоўскай любові, каб пасля яны не адчувалі патрэбу ў недаатрыманых пачуццях.

Ганна: — Справа ў тым, што ў савецкі час адбыўся перакос сямейных каштоўнасцяў. Праз год пасля нараджэння дзіця пачынала наведваць яслі, пазней — садок, затым школу. Я разумею, што пасляваенны час патрабаваў максімальнай мабілізацыі кожнага члена грамадства. Але гэты працэс зацягнуўся, перавандраваўшы ў мірны, стабільны час. Пастаянная адсутнасць, стомленасць, эмацыянальная закрытасць бацькоў загубілі напрацаваныя стагоддзямі стандарты сямейных узаемаадносін.

Павел: — Усведамленне таго, што адказнасць за выхаванне твайго дзіцяці ляжыць не на садку, школе, універсітэце, не на дзяржаве, а ў першую чаргу на табе, здольна цалкам змяніць карціну свету.

Ганна: — Ёсць адчуванне, што сённяшнія садкі, школы і ўніверсітэты працуюць па планах, распрацаваных яшчэ ў 60—70-я гады мінулага стагоддзя.

Павел: — Менавіта гэта прывяло нас да таго, што Ганна стала ініцыятарам хатняй адукацыі нашых дзяцей.

Нам хацелася б, каб нашы дзеці былі больш свабодныя, больш разняволеныя ў сваіх рашэннях. Мы, бацькі, павінны напоўніць іх жыццё сапраўднымі каштоўнасцямі.

Ганна ТРУБАЧОВА, Ганна ШАПАШНІКАВА.
Фота Аляксандра ЖДАНОВІЧА.

ВОКРУГ ФУТБОЛА

34 миллиона долларов на всех

В новом сезоне чемпионата Беларуси совокупный бюджет клубов высшей лиги составит 34,1 миллиона долларов.

Отметим, эта цифра на 4,3 миллиона меньше, чем в прошлом году. Тогда она, по некоторым данным, составила 38,4 млн долларов. Падение составило 11 процентов.

Бюджеты сократились у «Шахтера», «Белшины», брестского «Динамо», «Минска», «Нафтана». Также расходную часть сократил чемпион страны БАТЭ.

Отметим, что ранее председатель правления минского «Динамо» **Юрий Чиж** заявил, что в текущем году бюджет клуба сохранится на прежнем уровне и составит 7 млн долларов. Таким образом, столичная команда впервые за долгое время станет самой обеспеченной.

Сергей Павлюкович: «Давайте не будем о политике…»

Минское «Динамо» на встрече с болельщиками презентовало игровую форму от компании «Saller» на сезон-2014.

Также болельщики поинтересовались у генерального директора столичного клуба Сергея Павлюковича, планирует ли клуб писать фамилии футболистов на игровых майках на белорусском языке.

«Давайте не будем о политике, — ответил тот. *— Думаю, об этом надо спрашивать у игроков «Динамо». Ко мне никто из ребят не подходил и не просил написать его фамилию на белорусском языке».*

В долгах

Как сообщает «Вечерний Гродно», по итогам 2013 года долг гродненского «Немана» составил 4,3 миллиарда рублей (более 400 тысяч долларов).

По итогам 2013 года дефицит бюджета «Немана» составил 4,3 млрд рублей (430 тысяч долларов).

По сведениям, часть долгов перед футболистами уже погашена. Напомним, бюджет «Немана» в 2013 году равнялся 2,3 млн долларов.

В конце года вместо Леонида Дмитраницы генеральным директором клуба стал Сергей Сахаревич.

БАТЭ ведет переговоры с «Газпромом»

Председатель правлении ФК БАТЭ (Борисов) Анатолий Капский рассказал, как он относится к возможному участию команды в объединенном чемпионате СНГ, а также о финансировании клуба.

— Что касается объединенного чемпионата, то сегодня этот вопрос не стоит по политическим причинам, — сказал **Анатолий Капский**. — Скажу честно, нас в этот чемпионат не приглашали. Хотя мы контактировали с руководством «Газпрома» по этому вопросу по их инициативе. Понимаете, мы не живем за счет господдержки. В прошлом году БАТЭ получил около девяти миллиардов рублей, а это даже меньше, чем мы потратили на детей, волейбол и инфраструктуру. Мы стараемся зарабатывать, и пока у нас это получается. Но если бы создали лигу с финансированием бюджетов, как это предлагается, я был бы только «за». Это вызвало у меня большой интерес. Более того, сегодня мы с «Газпромом» ведем переговоры по поводу нашей академии. У них есть абсолютно безвозмездный проект — «Газпром детям».

Сергей Боровский: «Есть цель — выигрывать все подряд»

Главный тренер солигорского «Шахтера» Сергей Боровский рассказал о целях команды на сезон.

— Цели на сезон? Выигрывать все подряд. Но одного желания мало — необходима база. Много нового, поэтому все будет зависеть от того, насколько сможем держать структуру игры 90 минут. А здесь нужно терпение, как при сборке пазлов: крутишь, вертишь, а потом — хлоп! — и подобрал… Местами уже сейчас получается очень неплохо. Ребята сами на тренировках начали что-то обсуждать: мол, ты давай туда, а я сюда… Тренер сказал делать так, а они, исходя из этого, начинают друг другу подсказывать и даже что-то видоизменять. Хороший признак того, что игроки не бегают, как лошади с шорами. А как быстро зерно прорастет? Конечно, положительные результаты будут способствовать этому. Но и в случае неудач надо не останавливаться, идти своим путем. И, уверен, все обязательно получится.

Этот матч он уже отыграл…

А вот для экс-форварда могилевского «Днепра» Модибо Сидибе сезон закончился, так и не начавшись.

На днях футболист задержан правоохранительными органами в связи с нелегальным пребыванием на территории Беларуси. Нападающий из Нигера должен был покинуть Беларусь еще в декабре 2013 года, когда истек срок действия его визы, а «Днепр» отказался от услуг игрока. Однако Сидибе нелегально провел несколько месяцев в Минске, пока его не задержали сотрудники милиции. Игрок депортирован на родину…

СМАЧНА ЕСЦІ!

Алесь БЕЛЫ, гісторык: «Сорамна, што папулярызацыяй беларускай кухні спрабуе займацца Мінгандлю»

«Сорамна, што працэсам папулярызацыі беларускай кухні спрабуе займацца Міністэрства гандлю, выдае нейкія цыркуляры, нават спрабуе вырашыць, якія стравы, з іх пункту гледжання, самыя нацыянальныя. Яны што, тэсціравалі, наколькі гэтыя стравы самыя запатрабаваныя? Яны загадзя ведаюць густы і перавагі замежных турыстаў? Я скептычна стаўлюся да такога адміністрацыйнага падыходу», — заявіў гісторык, культуролаг, публіцыст і спецыяліст у галіне традыцыйнай беларускай кухні **Алесь Белы**.



Ён нагадаў, што Міністэрства гандлю рэкамендавала аб'ектам грамадскага харчавання на час правядзення ў Мінску чэмпіянату свету па хакеі ўключыць у меню шэраг страў беларускай нацыянальнай кухні і нават вызначыла, што гэта павінны быць за стравы.

На думку гісторыка, пытаннямі адраджэння і папулярызацыі нацыянальнай кухні павінны займацца ў тым ліку энтузіясты з прадпрымальнікаў, якія *«эксперыментуюць, спрабуюць адрадзіць тую ці іншую страву і назіраюць, наколькі гэта ўдала».*

Адначасова з гэтым у Беларусі трэба стварыць сістэму кулінарнай адукацыі менавіта ў галіне традыцыйнай кухні. У якасці прыкладу ён прывёў Літву, дзе ў школах вывучаюць дамаводства, у тым ліку кулінарыю.

«У стварэнні адпаведнага падручніка брала ўдзел старшыня літоўскага Фонду кулінарнай спадчыны Бірутэ Імбрасене. Дзеці вучацца гатаваць традыцыйныя літоўскія стравы, і зразумела, што ў такім выпадку культура кухні трывала ўваходзіць у іх свядомасць, — цытуе Алеся Белага БелаПАН. — *У нас жа знайсці кухара, тым больш шэф-кухара беларускай кухні проста немагчыма. Усё таму, што наша сістэма кулінарнай адукацыі іх не рыхтуе, тэхнікумы «не заточаны» пад беларускую кухню. Можа, яны вывучаюць некалькі гадзін нейкую колькасць беларускіх страў, і на гэтым усё».*

У той жа час, падкрэсліў гісторык, у краіне не існуе *«курсаў павышэння кваліфікацыі або паўторнага навучання»* спецыялістаў па нацыянальнай кухні.

ТЫМ ЧАСАМ

«Да чэмпіянату свету па хакеі не гатовы самі беларусы»

Днямі кулінарны блогер **Арына Лісецкая** распавяла гісторыю пра тое, як у Мінск прыязджаў дэгустатар са Швейцарыі, які хацеў паглядзець, як беларускія кафэ і рэстараны падрыхтаваліся да чэмпіянату свету—2014 па хакеі.



